

# «МЕНШ РАЗМОЎ — БОЛЬШ СПРАВЫ»

**Падрабязнасці кадравага дня ў Палацы Незалежнасці**

(Стар. 2–4)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

14 КАСТРЫЧНІКА 2025 г. АЎТОРАК № 198 (30586)

# ЦЯПЛО МАЦЯРЫНСКАГА СЭРЦА



**Дарагія суайчынніцы!**

**Прыміце самыя цёплыя віншаванні з Днём маці.**

**З'яўляючыся душой і абярэгам сям'і, вы клапатліва ствараеце ў доме ўтульнасць і гармонію, самаахвярна прысвячаеце сябе таму, хто дарагі чуламу мацярынскаму сэрцу. Гэта адначасова і вялікае шчасце, і велізарная адказнасць.**

**Вашы мудрасць, цярпенне і любоў дапамагаюць знаходзіць правільны шлях у любых жыццёвых сітуацыях. Дзякуючы разуменню і падтрымцы мы дасягаем поспехаў, атрымліваем сілу ў цяжкія і часам лёсавызначальныя моманты.**

**Асаблівыя словы ўдзячнасці і павагі — шматдзетным і прыёмным маці за дабрыню і душэўную шчодрасць.**

**Нізкі паклон вам, дарагія мамы. Жадаю моцнага здароўя і дабрабыту. Няхай шчаслівае ззянне дзіцячых вачэй натхняе вас на новыя здзяйсненні.**

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр Лукашэнка.**

*Матэрыялы да Дня маці чытайце на старонках 8–9.*

Фота Лізаветы ГОЛАД.

ЯКАЯ ЯНА, СУЧАСНАЯ МАЦІ?



8–9

ПЯЦІГОДКА ЯКАСЦІ

## ЛЯЧЫЦЬ СВАІМ

**Спецыялісты пра распрацоўку айчынных лекаў і перспектывы імпартазамяшчэння**

Беларускія вучоныя распрацоўваюць новыя прэпараты ад анкалалагічных, сардэчна-сасудзістых, інфекцыйных, спадчынных і іншых хвароб.
А дапамагаюць у гэтым розныя галіны навукі, у тым ліку генетыка: каб стварыць новыя лекі, напрыклад, ад раку, спачатку трэба знайсці слабае месца пухліны, так званую мішэнь, куды і будзе «біць» новы прэпарат.
Ствараюцца і айчынныя лекавыя сродкі-генерыкі, аналагі прэпаратаў ад вядомых вытворцаў, якія сышлі з нашага рынку. Гэта не толькі імпартазамяшчэнне, але і нацыянальная лекавая бяспека.



СТАР. 12

**Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!**

ISSN 1990 — 763X

# «МЕНШ РАЗМОЎ —

## Падрабязнасці кадравага дня

«Вы ідзяце кіраўнікамі ў няпросты перыяд. Вельмі няпросты. Сёння ніхто не ведае, які будзе свет заўтра», — папярэдзіў прызначаных на пасады ў кадравы панядзелак Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы ўзгадніў кандыдатуры новых кіраўнікоў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, буйных дзяржаўных прадпрыемстваў, арганізацый, прызначыў новых прадстаўнікоў дыпмісій.



І па традыцыі кадравых дзён Аляксандр Лукашэнка расставіў акцэнты, на якія навапрызначаным трэба звярнуць пільную ўвагу на месцах іх адказнасці.

### «НІ Ў ЯКІМ РАЗЕ НЕЛЬГА РАССЛАБЛЯЦЦА»

Прэзідэнт даў згоду на прызначэнне Аляксандра Камендanta першым намеснікам старшыні Мінскага гарвыканкама, Аляксандра Новікава — старшынёй Гомельскага райвыканкама. Уладзімір Антоненка прызначаны старшынёй Жыткавіцкага райвыканкама, Дзяніс Ядчанка — старшынёй Нараўлянскага райвыканкама. Мікалай Клімянок узначаліў Лоеўскі райвыканкам, Юрый Касталамаў — Зэльвенскі райвыканкам, Андрэй Гардзей — Смаргонскі райвыканкам. Аляксандр Курыла — старшыня Карэліцкага райвыканкама.

Прэзідэнт падкрэсліў, што добра ведае раёны, у якія ўзгадніў новых кіраўнікоў. Да старшыняў райвыканкамаў ён звярнуўся, зыходзячы з вопыту сваіх нядаўніх наведванняў раёнаў. «Хачу, каб вы запомнілі галоўнае. Чыіхсьці прадпрыемстваў, зямель, кустоў або вёсак, акрамя вашых, няма. Вы там за ўсё адказваеце», — папярэдзіў беларускі лідар.

Паводле слоў Прэзідэнта, усё роўна: прыватнае прадпрыемства, рэспубліканскага, абласнога або раённага падпарадкавання — гэта адказнасць старшыні райвыканкама.

**«Яно можа каму заўгодна належаць, але кадравую палітыку і парадак забяспечваеце там вы. Я хачу, каб вы гэта пачулі. Калі ёсць нейкае неразуменне, там ёсць мае памочнік Прэзідэнта і ўпаўнаважаны — усе вышэйшыя службовыя асобы. Калі ёсць нестыкоўка — калі ласка, звяртайцеся, вырашайце пытанні», — расставіў акцэнты кіраўнік дзяржавы.**

Выказаўся Прэзідэнт і аб бягучым моманце ў сельскай гаспадарцы, у прыватнасці аб тым, што выклікае ў яго насцярожанасць, — аб уборцы кукурузы. «Вы ведаеце, што кукурузу на сілас сёння прыбіраюць яшчэ. Хоць я не ўяўляю, які там можа атрымацца сілас. Кукуруза ўжо высахла, яшчэ не перасохла, але высахла. Таму вызначайцеся на месцы: калі з гэтай кукурузнай масы можна прыгатаваць сілас, гатуйце. Рабіце ўсё якасна, каб не было кіслаты гэтай, каб не атрымаўся гнілаж нейкі ў вас у траншэях, а потым жывёла падзе, асабліва цяляты, — параіў Аляксандр Лукашэнка. — І кукуруза на зерне. Не трэба спадзявацца, што падсохне і кукурузу на зерне ўбяром. Не забывайце, што кукуруза можа заразіцца рознага роду грыбковымі захворваннямі, а то і наогул у пачатках згніе. Таму ў любы момант, калі можна, убірайце кукурузу. Калі ў ёй высокае ўтрыманне вільгаці — плюшчыце. Плюшчылак закупілі дастаткова — працуйце. Не

## Даслоўна

Аб планах, задачах, мэтах і сродках іх дасягнення навапрызначаныя кіраўнікі падзяліліся з журналістамі.

### УВЕСЬ СПЕКТР ДЗЕЙНАСЦІ ПРАДПРЫЕМСТВА ПАТРАБУЕ НЕАД'ЕМНАЙ УВАГІ КІРАЎНІКА



**Новы генеральны дырэктар ААТ «Гомсельмаш» Віталь ШЭЛЕГ** першай задачай назваў якасць прадукцыі. «Другая задача — гэта эканоміка. Як акцэнтуе ўвагу Прэзідэнт, будзе эканоміка — будзе ўсё. Акрамя таго, гэта праца на знешнім рынку. Сёння прадпрыемства знаходзіцца ў стабільным стане. Цяпер у свеце вялікая турбулентнасць, што выклікае пэўныя складанасці. Прадпрыемства спраўляецца з усімі праблемамі, але нельга забываць аб эканоміцы», — падкрэсліў ён.

Журналісты ўдакладнілі, наколькі камбайн «Гомсельмаша» беларускі з пункту гледжання кампанентаў. Віталь Шэлег адказаў, што 95 % камплектуючых — айчыннай вытворчасці. Яны вырабляюцца ў Рэспубліцы Беларусь на галаўной пляцоўцы і на сумежных прадпрыемствах, якія працуюць па прамкааперацыі ўнутры нашай краіны.

Важны аспект — сэрвіснае абслугоўванне тэхнікі. «Сэрвіс сёння — гэта неад'емная частка якасці. Якасць датычыцца не толькі машыны, але і паслуг, якія можа выконваць гэта машына. І сэрвіснае абслугоўванне — адна з самых сур'ёзных задач. У гэтым кірунку і будзем рухацца», — канстатаваў кіраўнік «Гомсельмаша».



Першай задачай для «Магілёўхімвалакна» **новы генеральны дырэктар Алег КУРЫЛІН** назваў неабходнасць вывесці прадпрыемства на нармальны ўзровень работы. «Разабрацца са стратамі і, адпаведна, павялічыць занятасць людзей на праектах, якія рэалізуюцца. Прадпрыемства цяпер знаходзіцца на той стадыі, на якой старыя або маральна састарэлыя магутнасці выводзяцца. І неабходна задзейнічаць вызваленых людзей на праектах, якія знаходзяцца ў рэалізацыі», — удакладніў ён. Як прыклад — інвестпраект, звязаны з дрэваапрацоўчай прамысловасцю. Цяпер ён праходзіць экспертызу, і да 2028 года прадугледжана яго рэалізацыя. Алег Курылін растлумачыў, што гаворка ідзе аб вытворчасці хларату натрыю і пераксісу вадароду. «Кантракт ужо падпісаны, контрагент — кітайскі бок. Праект маштабны, тым больш для нас новы. Такіх вытворчасцяў у нас у краіне няма, таму ён няпросты. Але задача пастаўлена, і мы будзем яе рэалізоўваць», — падкрэсліў новы генеральны дырэктар прадпрыемства.

Яшчэ адной задачай Алег Курылін назваў неабходнасць аптымізацыі выдаткаў і зніжэння залежнасці ад імпартнай сыравіны. «Сыравіну пастаўляюць тыя кампаніі, што самі з'яўляюцца непасрэдна вытворцамі прадукцыі, якую вырабляе «Магілёўхімвалакно». Мы разумеем, што знайсці там добрую цану на сыравіну даволі праблематычна», — сказаў ён.

«Прадпрыемства — гэта жывы арганізм, таму там няма няважных кірункаў. Гэта і кадры, і чалавечы патэнцыял, і фінансавыя пытанні ў частцы забеспячэння сябе ўласнымі абаротнымі сродкамі. Гэта, безумоўна, якасць прадукцыі, на чым мы таксама засяродзім сваю ўвагу. Продаж — без яго таксама нікуды. Увесь спектр дзейнасці прадпрыемства патрабуе неад'емнай увагі кіраўніка», — падкрэсліў **Андрэй СОЙКА, новы генеральны дырэктар ААТ «Белшына».**



Журналісты пацікавіліся магчымым пашырэннем асартыменту прадукцыі. Кіраўнік «Белшыны» заўважыў, што ў любым бізнес-працэсе трэба ацэньваць мэтазгоднасць укаранення той ці іншай навацыі. «Безумоўна, ёсць кірункі, якія здаюцца выдавочнымі, напрыклад, шыны для матаблокаў. Але заўсёды трэба ўзважваць аб'ём рынку гэтай прадукцыі і разумець выдаткі, якія неабходныя для асваення гэтай прадукцыі. Беларускі рынак для нас, вядома, будзе прыярытэтам», — растлумачыў ён.



**Рэктар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Дзяніс ДУК** звярнуў увагу, што гэта ВНУ — равесніца суверэннай Беларусі. І за 35 гадоў існавання ўстановы склаліся моцныя традыцыі падрыхтоўкі кіраўнікоў высокага ўзроўню. Але час не стаіць на месцы, выклікі сур'ёзныя, і яны ставяць перад кіраўніком шмат задач, якія трэба аператыўна вырашаць. «І задача Акадэміі — дапамагчы кіраўнікам вырашыць гэтыя задачы, для чаго трэба ўкараняць нестандартныя падыходы, але ўкараняць іх з апорай на традыцыі. Мы павінны вывесці на яшчэ больш высокі ўзровень гордае імя Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце, — падкрэсліў Дзя-

# БОЛЬШ СПРАВЫ»

## ў Палацы Незалежнасці

абавязкова зерне кукурузы сушыць. Гэту тэхналогію вы ведаеце».

Што датычыцца ўборкі буракоў, кіраўнік дзяржавы таксама заклікаў не расслабляцца — невядома, якое будзе надвор'е. Сяўбу азімых, па словах кіраўніка дзяржавы, на гэтым тыдні трэба завяршаць. Тым больш засталося не так шмат.

**«Трэба перастаць сеяць азімыя культуры, адсеем яравымі. І неабходна маштабна заняцца ўзворваннем, уздымам зябліва. Хоць адзін трактар у гаспадарцы павінен працаваць з плугам. Так, год незвычайны, усё зрушылася, перасунулася. Але на каго мы будзем крыўдзіцца? З аднаго боку, незвычайны, з другога — ураджайны. Таму трэба напружвацца. Ні ў якім разе нельга расслабляцца. Трэба ўбраць кукурузу, буракі і пераараць глебу», — акрэсліў кола задач Прэзідэнт.**

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на яшчэ адзін важны аспект — работу з людзьмі.

**«Усе сёлы, вёскі, мястэчкі, пасёлкі гарадскога тыпу — усё гэта ваша, і людзі там вашы. Таму працуйце, не адпіхвайцеся, не адбрыквайцеся ад людзей. Яшчэ раз паўтараю: для нашага чалавека часам важна проста сустрэцца і пагаварыць. Не трэба сябе адчуваць на галаву вышэй за звычайных людзей. Гэта нашы людзі, мы для іх працуем», — параіў кіраўнік дзяржавы кіраўнікам райвыканкамаў.**

## «ЯКАСЦЬ ПЕРШ ЗА ЎСЁ»

Прэзідэнт даў згоду на прызначэння Андрэя Сойкі генеральным дырэктарам ААТ «Белшына», Алега Курыліна — генеральным дырэктарам ААТ «Магілёўхімвалакно», Віталя Шэлега — генеральным дырэктарам ААТ «Гомсельмаш».



Аляксандр Лукашэнка заявіў, што па «Белшыне» і «Магілёўхімвалакне» размоў больш быць не павінна. Па яго словах, новыя кіраўнікі — людзі талковыя, якія выцягнуць гэтыя прадпрыемствы. «Не спадзявайцеся, што вы прыйдзеце і з бюджэту возьмеце грошы. Грошы атрымаеце толькі пад канкрэтныя пастаўкі прадукцыі. Ёсць у вас заўтра на экспарт прадукцыя, і цвёрда вы атрымаеце грошы — вось вам пазычым капейку, прадалі — і назад вярнулі. Пра гады нейкія, стагоддзі, дзесяцігоддзі гаворкі не ідзе. Узяў — заўтра вярнуў. Толькі так», — папярэдзіў Прэзідэнт. Па яго словах, «Белшына» і «Магілёўхімвалакно» — асноўныя прадпрыемствы Магілёўскай вобласці, таму новым кіраўнікам разам з калектывамі трэба вырашыць, як іх выцягваць.

Што датычыцца «Гомсельмаша», то, па словах кіраўніка дзяржавы, прадукцыя гэтага прадпрыемства патрэбная ўсюды. Былы генеральны дырэктар Аляксандр Новікаў перайшоў на пасаду старшыні Гомельскага райвыканкама, і Прэзідэнт даручыў яму перадаць усе кампетэнцыі, вопыт і навыкі новаму генеральнаму дырэктару, дапамагаць, калі ўзнікне патрэба. Аляксандр Лукашэнка зрабіў акцэнт на тым, што галоўнае — гэта якасць, і гэта актуальна не толькі для «Гомсельмаша», але і для іншых прадпрыемстваў.

**«Якасць перш за ўсё. Будзе добрая якасць — будзьце ўпэўнены, што асноўны рынак, Расійская Федэрацыя, спажыве вашу тэхніку, ім патрэбна якасць, — канстатаваў беларускі лідар.**

— На «Гомсельмашы» мы яшчэ з вамі сустрэнемся, вы мне даложыце разам з былым кіраўніком (былых не бывае), як ідуць справы».

## «СВІСТАПЛЯСКА З КАДРАМІ НЕДАПУШЧАЛЬНАЯ»

Дзяніс Дук, які быў рэктарам Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Аркадзя Куляшова, прызначаны рэктарам Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. На гэтай пасадзе ён змяніў Ігара Бузоўскага, які кіраваў ВНУ з чэрвеня 2024 года. «Свістапляска з кадрамі ў Акадэміі кіравання недапушчальная. Гэта страшны касяк Адміністрацыі Прэзідэнта», — заявіў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрыя Кругота.

Новаму рэктару беларускі лідар паставіў задачу вывесці акадэмію на лідзіруючыя пазіцыі. Прэзідэнт таксама даручыў не пакідаць без увагі Магілёўскі дзяржуніверсітэт, знайсці туды новага рэктара. «Я вельмі-вельмі разлічваю на вашу работу ў Акадэміі кіравання. Але і ўніверсітэт Куляшова не павінен стаць на калені. Падбірайце новага рэктара. Патрэбны моцныя кандыдатуры. Універсітэт невялікі, але няпросты, таму падключайся да гэтага пытання, дапамагай вырашыць кадравае пытанне там, памірай, але Акадэмія кіравання павінна быць найлепшай у краіне», — звярнуўся Аляксандр Лукашэнка да Дзяніса Дука.

«Таварыш Прэзідэнт, задача будзе выкананая», — адказаў рэктар.

*(Заканчэнне на 4-й стар.)*

ніс Дук. — Сёння дыстанцыйная форма, анлайн-навучанне — гэта форма, якая найменш энерга- і працазатратная. Кіраўнік, застаючыся на месцы, можа навучацца анлайн і атрымліваць усе неабходныя адказы на пытанні. Для гэтага ёсць чат-боты, анлайн-сувязь, дзе можна задаць пытанні. А ўжо пасля працы або ў камфортны для яго час ён можа на гэтыя пытанні атрымаць адказ ад вядучых спецыялістаў. Іншымі словамі, гэта пытанні ад зямлі, на якія адказвае дасведчаны практык, тым самым дапамагаючы кіраўніку вырашаць пытанні на месцах».

## БЕЗ КАМАНДЫ НІЧОГА НЕМАГЧЫМА ВЫРАШЫЦЬ



**Аляксандр КАМЕНДАНТ да прызначэння першым намеснікам старшыні Мінскага гарвыканкама** ўзначальваў камітэт эканомікі Гродзенскага аблвыканкама. «Кола задач падобнае, але ўзровень зусім іншы. Сярод задач — такія сферы, як інвестыцыі, знешнеэканамічная дзейнасць, гандаль, грамадскае харчаванне, прамысловы комплекс. Ёсць і некаторыя новыя для мяне кірункі. Напрыклад, транспарт і сувязь», — расказаў Аляксандр Камендант. Ён прызнаўся, што ніколі не працаваў у Мінску. «Спадзяюся і перакананы, што Мінск не моцна адрозніваецца ад Гродна. І гродзенцы, і мінчане падобныя, бо ўсе мы з'яўляемся грамадзянамі адной краіны і, па сутнасці справы, выконваем адны задачы», — падзяліўся Аляксандр Камендант.



**Андрэй ГАРДЗЕЙ узначаліў Смаргонскі раён** — адзін з валаўтваральных раёнаў Гродзенскай вобласці, які сабраў прадпрыемствы дзяржаўнай і прыватнай формы ўласнасці, гандаль і развітую сельскую гаспадарку. «Кіраўніком дзяржавы пастаўлена задача разам з людзьмі навесці парадак у раёне ў цэлым і ў кожным населеным пункце паасобку. І ўсе гэтыя задачы будуць вырашаны пры каманднай працы, бо без каманды немагчыма вырашыць», — падзяліўся ён.

## МЫ САМІ ПАВІННЫ РАЗУМЕЦЬ, ШТО НАША, БЕЛАРУСКАЕ, ТРЭБА КУПЛЯЦЬ



**Надзея ЛАЗАРЭВІЧ, старшыня «Беллегпрама»,** звярнула ўвагу, што цяпер няпроста працаваць не толькі сферы лёгкай прамысловасці, але і іншым галінам. І новае бачанне тут лішнім не будзе. «Задачы, якія паставіў кіраўнік дзяржавы, трэба рэалізаваць у самыя кароткія тэрміны. Мы абавязкова будзем працаваць у камандзе. Было агучана, што ў «Беллегпрам», магчыма, трэба ўносіць нейкія структурныя змены, пашыраць нейкімі іншымі прадпрыемствамі. Упэўнена, што гэта неабходна рабіць, — падкрэсліла старшыня канцэрна. — Нам трэба адпрацаваць увесь комплекс задач, пастаўленых кіраўніком дзяржавы. Гэта датычыцца ў тым ліку абутку, вытворчасці тканін, посуду». Па словах Надзеі Лазарэвіч, трэба не толькі захаваць брэнд Добрушскага фарфоравага завода, але і развіць яго. Тым больш што сфер для гэтага шмат.

«Будзем укараняць новыя тэхналогіі, развіваць тэхналагічны патэнцыял прадпрыемстваў. Вельмі шмат залежыць ад людзей. Зразумела, што ў нашай краіне ўсё будуецца на сумленным адкрытым дыялогу з урадам. Кіраўнік дзяржавы сказаў, што пры правільным падыходзе абавязкова будзе і яго падтрымка ў тым ліку. Таму будзем працаваць, развіваць гэты ўнікальны брэнд як частку гісторыі нашай краіны», — падзялілася Надзея Лазарэвіч. Яна назвала «Беллегпрам» не проста канцэрнам, а часткай гісторыі нашай краіны, якую трэба захаваць.

У гэтым кірунку трэба прымаць меры для абароны ўнутранага рынку, павышэнні канкурэнтаздольнасці прадукцыі. «Забараняць або закрываць што-небудзь не наш варыянт. Неабходна паглядзець, як падтрымаць прадпрыемствы, каб мы сталі больш канкурэнтныя, каб з'явілася «паветра» для стварэння чагосьці новага ў выглядзе пераўзбраення вытворчасці. Вядома, абараняць трэба сваё, але многае залежыць і ад нас. Мы самі, прыходзячы ў краму, павінны разумець, што наша, беларускае, трэба купляць. Але вельмі шмат залежыць і ад вытворцы, які павінен зрабіць канкурэнтную і цікавую для спажыўца прадукцыю», — пераканана Надзея Лазарэвіч. Як асобны кірунак, з якім варта працаваць, яна назвала маркетплэйс. «Я лічу, што, адпрацаваўшы з нашымі буйнымі маркетплэйсамі, мы знойдзем там сваю нішу і будзем прадаваць нашу прадукцыю з лепшымі паказчыкамі, чым у нас ёсць сёння», — адзначыла старшыня «Беллегпрама».

*(Працяг на 4-й стар.)*

# «МЕНШ РАЗМОЎ — БОЛЬШ СПРАВЫ»

## «ГАЛІНУ ТРЭБА ВЫЦЯГНУЦЬ»

З панядзелка пачаўся новы этап у гісторыі канцэрна «Беллегпрам» — яго ўзначаліла Надзея Лазарэвіч, якая да гэтага займала пасаду першага намесніка старшыні Мінскага гарвыканкама. Былы кіраўнік канцэрна Таццяна Лугіна прызначана генеральным дырэктарам ААТ «Камволь».

«Як мяне інфармуюць і Адміністрацыя Прэзідэнта, і ўрад, у канцэрне сітуацыя няпростая з розных прычын. І, заўсёды ставячыся з недаверам да нейкай інфармацыі, у дадзеным выпадку я веру ў тое, што там сітуацыя няпростая», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, што пасада старшыні канцэрна — фактычна міністэрская пасада. «Тут нам трэба яшчэ паглядзець па рэфармаванні сістэмы кіравання. Можа быць, стварыць міністэрства без усялякіх гэтых канцэрнаў, калі гэта трэба будзе, дзесьці нешта дадаўшы, дзесьці нешта забраўшы. Гэта мы асобна паглядзім», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Па словах беларускага лідара, няпростая сітуацыя і на «Камволі» — прадпрыемства з'яўляецца значным кірункам дзейнасці «Беллегпрама». Аляксандр Лукашэнка згадаў, што неаднаразова бываў там, яму была аказана сур'ёзная падтрымка.

> **«Фактычна з балота выцягнулі прадпрыемства, якое цалкам развалілася. Трэба было яго ратаваць — уклалі немалыя сродкі. Вызначыліся, здаецца, па кірунках дзейнасці», — нагадаў кіраўнік дзяржавы і заўважыў, што вынікі сёння «не ахці».**

Вяртаючыся да сферы дзейнасці «Беллегпрама» ў шырокім сэнсе, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што трэба ўважліва паглядзець на льновытворчасць, прааналізаваць, як сельская гаспадарка спрацавала ў гэтым кірунку. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, нельга ўпусціць вытворчасць абутку, якая заўсёды была нашым брэндам. Па яго словах, гэта прадукцыя вельмі запатрабаваная на расійскім рынку.

> **«Людзі нават не глядзяць на цану, калі бачаць беларускае. Дык чаму мы не прадаём? Усё крыўдзімся на тое, што аднекуль хтосьці штосьці завозіць. Дык гэта ж канкурэнцыя. Нам давядзецца ў канкурэнцыі гэтай жыць. Але, вядома, празмернасцяў быць не павінна — унутраны рынак неабходна абараняць. Трэба падумаць ва ўрадзе, як гэта зрабіць. Мы шмат пра гэта гаворым, але мала робім», — падкрэсліў Прэзідэнт.**

Па яго словах, сёння мы можам прадаваць сваю прадукцыю не толькі ў Расіі, але і на іншых рынках. Трэба толькі падцягнуць якасць. «Гэта мая задача — адкрыць дзверы: заходзьце, працуйце. Целяпаліся, Амана гэтага не бачылі. Яны з задавальненнем нас прымаюць. Парты, заводы — калі ласка, бярыце, змешвайце калійныя ўгнаенні, вырабляйце новыя там, прадавайце. Столькі кірункаў адкрываецца!» — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, Аман гатовы рэалізоўваць маштабныя праекты і на тэрыторыі Беларусі, напрыклад будаўніцтва цэлюлозна-кардоннага камбіната. «Гэта ж пад два мільярды інвестыцый. Яны даводзяць, гатовы ў нас будаваць яго», — адзначыў Прэзідэнт. Яшчэ адзін красамоўны прыклад — стварэнне ў Амане беларускага турыстычнага кластэра, пад які аманскі бок выдзяляе зямлю. «Вось, калі ласка, прыходзьце, працуйце, дзверы адчыненыя. Але трэба ісці, трэба ісці!» — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Звяртаючыся да Надзеі Лазарэвіч і Таццяны Лугінай, Прэзідэнт заявіў: «Я наогул схіляюся перад жанчынамі заўсёды. І на такой няпростай пасадзе вам прыйдзецца працаваць — кіраўніком. Але павінен сказаць, што гэта апошні шанц для вас. Калі толькі вы не зможаце спрацаваць, я больш з вамі размаўляць не буду. Вы граматныя, вопытныя. Менш размоў — больш справы».

«Я вам адкрытым тэкстам кажу: або вы самі выбудуеце свой лёс на будучыню (усё, што ад вас залежыць), або ў мяне проста не будзе слоў з вамі размаўляць. Разумейце мяне як хочаце, але выцягнуць гэту галіну трэба, — працягнуў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта людзі. Трэба накарміць і апрануць людзей. Накарміць, здаецца, накармілі. І апранулі. Але трэба не выпусціць гэта ўсё. Дзейнічайце, і толькі наперад. Іншага шляху няма».

***

Аляксандр Лукашэнка прыняў кадравыя рашэнні і па складзе дыпламатычнага корпуса Беларусі. Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Калумбія, Рэспубліцы Панама і Рэспубліцы Эквадор па сумяшчальніцтве прызначаны Дзмітрый Дзеравінскі. Ён таксама з'яўляецца паслом Беларусі ў Венесуэле. Дзмітрый Красоўскі прызначаны Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Уганда па сумяшчальніцтве. Цяпер ён узначальвае беларускую дыпмісію ў Кеніі. Дзмітрый Красоўскі таксама па сумяшчальніцтве з'яўляецца пастаянным прадстаўніком Беларусі пры Афрыканскім саюзе, праграме ААН па навакольным асяроддзі (ЮНЭП) і праграме ААН па населеных пунктах (ААН-Хабітат).

Прэзідэнт даў згоду на прызначэнне Аляксандра Сідарука Генеральным консулам Рэспублікі Беларусь у горадзе Хашымін (Сацыялістычная Рэспубліка В'етнам). Сяргей Вяргейчык узгоднены на пасаду сакратарыята Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва, Ларыса Лукіна — на пасаду рэферэнта Сакратарыята ШАС.

Па ўзгадненні з Прэзідэнтам Сяргей Шчарбакоў прызначаны намеснікам старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Кіраўнік дзяржавы ўзгадніў прызначэнні ў кіраўніцтве шэрагу міністэрстваў. Пасаду першага намесніка міністра па падатках і зборах заняў Уладзімір Муквіч. У гэтым жа ведамстве на пасаду намесніка міністра ўзгоднена кандыдатура Вольгі Старавойтавай. Аляксей Стасюкевіч — намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. На пасаду намесніка міністра прамысловасці ўзгоднены Леанід Рыжкоўскі. Новы намеснік і ў міністра транспарту і камунікацый. Гэту пасаду заняў Сяргей Мацукоў.

## Даслоўна



**Генеральны дырэктар ААТ «Камволь» Таццяна ЛУГІНА** заявіла, што найперш на прадпрыемстве трэба правесці інвентарызацыю бізнес-працэсаў, пачынаючы ад тэхналагічнага стану абсталявання, праверыць кадравую палітыку. Па яе словах, сёння на прадпрыемстве працуе больш за 50 працоўных мігрантаў, трэба вырашаць пытанне з працоўнымі кадрамі на будучыню, каб загрузіць магутнасці вытворчасці.

Асобную ўвагу Таццяна Лугіна звярнула на маркетынг і збыт. «У нашай краіне людзей, мне здаецца, ужо пераконваць не трэба, што якасць тканін і вырабаў «Камволя» сапраўды адпавядае заяўленым якасным параметрам. Але пакуль не атрымалася заявіць пра сябе як пра сапраўды моцны беларускі брэнд стыльнага мужчынскага і жаночага дзелавога адзення. Акрамя гэтага, вядома, трэба разумець, праз якія каналы гэтыя адзенне і тканіны могуць рэалізоўвацца», — растлумачыла Таццяна Лугіна. Адсюль вынікае яшчэ адна задача — дыверсіфікацыя асартыменту і нарошчванне выручкі.

«Камбінат мае самае сучаснае абсталяванне, тканіны адпавядаюць высокім патрабаванням. Выстаўка «ІНАПРАМ. Беларусь» паказала, што мы можам вырабляць тканіны самага высокага класа. Таму трэба працаваць менавіта ў маркетынгу, у развіцці брэнда як унутры краіны, так і за яе межамі. У нас ёсць канкрэтнае даручэнне, будзем працаваць», — падкрэсліла генеральны дырэктар прадпрыемства.

Па словах Таццяны Лугінай, лёгкая прамысловасць Беларусі не можа будавацца на мас-маркеце, паколькі там вельмі высокая канкурэнцыя. «Беларуская лёгкая прамысловасць павінна працаваць у іншай мадэлі бізнесу. Мы павінны ўзяць курс на фарміраванне свайго брэнда і максімальна заваёўваць лаяльнасць у той катэгорыі насельніцтва, на якую разлічаны гэты брэнд, — адзначыла яна. — Сёння перадзел адбываецца не толькі глабальна ў свеце, але ў галінах у тым ліку. Мы разумеем, што глядзім у будучую эпоху, якая будзе звязаная з абсалютнымі продажамі праз маркетплэйсы, інтэрнэт-гандаль. Мы разумеем, што штучны інтэлект будзе дапамагаць, яго можна і трэба выкарыстоўваць у розных сферах, у тым ліку на прадпрыемствах, каб зніжаць выдаткі».

**Валерыя СЦЯЦКО. Фота БелТА.**

---

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# «НАМ ЁСЦЬ КУДЫ ІМКНУЦЦА»

### Прэм'ер-міністр Аляксандр ТУРЧЫН правёў сустрэчу з дэлегацыяй Узбекістана



На сустрэчы ва ўрадзе, якая прайшла ўчора, 13 кастрычніка, ішла размова аб гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве Беларусі і Узбекістана.

— Мы рады вітаць дэлегацыю Рэспублікі Узбекістан у Мінску. У канцы верасня мы з паважаным Абдулой Нігматавічам Арыпавым (Прэм'ер-міністрам Узбекістана. — **Заўв. аўт.**) дамовіліся вырашаць усе пытанні хутка і без лішніх затрымак, і ваш візіт — таму пацвярджэнне, — адзначыў Аляксандр Турчын і растлумачыў чаму: — Літаральна ў пятніцу мы з ім стэлефанаваліся — і вы тут.

Прэм'ер-міністр падкрэсліў, што для нашай краіны Узбекістан з'яўляецца стратэгічным партнёрам:

— Але, аналізуючы лічбы нашага ўзаемнага тавараабароту, хачу сказаць: нам ёсць куды імкнуцца. Інтэнсіўна ідзе наша супрацоўніцтва, і я магу з задавальненнем адзначыць рост тавараабароту ў бягучым годзе. Аднак лічбы, вядома, нам трэба павялічваць.

Аляксандр Турчын дадаў, што сёння супрацоўніцтва Беларусі з Узбекістанам праходзіць не толькі ў форме гандлю, але і ў тым ліку ў фармаце ўзаемных інвестыцый.

— Нашы бізнесмены актыўна ідуць і інвесціруюць у вашу краіну, — акцэнтаваў увагу Прэм'ер-міністр.

Ён прывёў у прыклад шэраг буйных праектаў, сярод якіх будаўніцтва прадпрыемства па перапрацоўцы мяса птушкі, швейнае прадпрыемства, якое сёння функцыянуе ў Рэспубліцы Узбекістан.

— Інтэнсіўна ідзе ўзаемадзеянне на розных палях супрацоўніцтва: жаночы форум (ІІІ Беларуска-Узбекскі жаночы бізнес-форум. — **Заўв. аўт.**), які адбыўся сёлета ў Віцебску, і міжурадавая камісія, якую Юрый Вітольдавіч (Шулейка, намеснік Прэм'ер-міністра. — **Заўв. аўт.**) праводзіў у Мінску. Таму двухбаковая работа ідзе актыўна і інтэнсіўна, — падкрэсліў Аляксандр Турчын.

Дарэчы, за 8 месяцаў узаемны тавараабарот дадаў 34 %. Аб гэтым на сустрэчы паведаміў **першы намеснік міністра эканомікі і фінансаў Узбекістана Ілхом НАРКУЛАЎ.**

Ён запэўніў, што кіраўніцтва Узбекістана цвёрда прыхільнае да далейшага росту аб'ёмаў гандлю з Беларуссю.

# З АКЦЭНТАМ НА ДУХОЎНАСЦЬ І МАРАЛЬНАСЦЬ

## У Палаце прадстаўнікоў прайшла сустрэча з членамі Беларускай асацыяцыі шматдзетных бацькоў

На мерапрыемстве, прымеркаваным да Дня маці, у адрас прадстаўніц арганізацыі, а таксама ўсіх жанчын, якія выхоўваюць дзяцей, прагучалі віншавальныя словы ад дэпутацкага корпуса краіны. У Авальнай зале, дзе прымаюцца найважнейшыя заканадаўчыя рашэнні, абмяркоўваліся пытанні, якія хвалююць шматдзетныя сем'і. Асобным блокам прагучала тэма выхавання падрастаючага пакалення з апорай на духоўна-маральныя каштоўнасці.

Як звярнуў увагу **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА**, Прэзідэнт неаднаразова падкрэслівае, што мацярынства — самае высокае прызванне жанчыны, а пакланенне перад маці, шанаванне традыцыйных сямейных каштоўнасцяў з'яўляюцца аднымі з ключавых асабліваасцяў сучаснага грамадства.

«Думаю, што дзяржаўную падтрымку многія з вас, асабліва жанчыны маладога ўзросту, паспелі адчуць, — канстатаваў спікер. — Гэта і сямейны капітал, які з'явіўся ў суверэннай Беларусі, і адрасная сацыяльная дапамога. Я ўжо не кажу пра трохгадовы дэкрэтны адпачынак, які аплачваецца. І гэта не ўсе гарантыі і сацыяльныя выгоды».

Па словах Ігара Сяргеенкі, пытанні падтрымкі мацярынства і дзяцінства ўвасоблены ў рэальных заканадаўчых і іншых нарматыўных прававых актах.



Не могуць не радаваць адносіны моладзі да традыцыйных сямейных каштоўнасцяў. «Апытанне, праведзенае Інстытутам сацыялогіі НАН Беларусі ў першым квартале бягучага года, сведчыць аб тым, што прыярытэтамі сярод моладзі з'яўляецца выхаванне дзяцей (68 %), важнасць сям'і (65 %)», — канкрэтызаваў спікер.

Ігар Сергяенка звярнуў увагу на тое, што сям'я аказвае важную дапамогу дзяржаве ў пытанні патрыятычнага выхавання грамадства. Па яго словах, сёння шмат гаворыцца аб тым, што фарміраванне грамадзяніна нашай краіны адбываецца ў школе. «Аднак усё-такі першаасновай для выхавання годнага грамадзяніна нашай краіны з'яўляецца сям'я», — падкрэсліў спікер.



Як падзялілася ў размове з журналістамі **маці пяцярых дзяцей Алена ЖУРАЎЛЁВА**, дзяржаўную падтрымку шматдзетныя сем'і адчуваюць ва ўсіх сферах. «Адносіны да нас і з боку работадаўцы, і з боку школы, дзіцячага садка вельмі добразычлівыя, — канстатавала шматдзетная маці. — Заўсёды можна дамовіцца аб больш вольным графіку. Калі дзецям патрэбна ўдзельнічаць у дадатковых мерапрыемствах, дастаткова лёгка вырашаецца пытанне з графікам навучання ў школе. Акрамя той каласальнай матэрыяльнай падтрымкі, якую атрымліваюць шматдзетныя сям'і, з кожным годам усё больш адчуваем маральную падтрымку, якая, на мой погляд, важнейшая, чым матэрыяльная».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

## У тэму

# У БЕЛАРУСІ СТАРТУЕ ТЫДЗЕНЬ БАЦЬКОЎСКАЙ ЛЮБОВІ

**Сёння ў краіне адзначаецца Дзень маці, які святкуецца ў Беларусі з 1996 года. З гэтага ж дня пачынаецца і Тыдзень бацькоўскай любові, які завершыцца Днём бацькі 21 кастрычніка. У гэтыя дні пройдзе шэраг тэматычных мерапрыемстваў, прысвечаных самым важным у жыцці кожнага чалавека людзям.**

У абласных, гарадскіх і раённых выканаўчых камітэтах арганізаваны ўрачыстыя прыёмы па ўзнагароджанні ордэнам Маці жанчын, якія з'яўляюцца прыкладам мацярынства, любові і адказнага выхавання дзяцей. Сёлета гэтай дзяржаўнай узнагароды ўдастоена 458 жанчын, а ўсяго з 1998 года — больш за 14 тысяч маці.

Гэтымі днямі будуць падведзены вынікі творчага конкурсу сярод сродкаў масавай інфармацыі «Моцная сям'я — моцная дзяржава», сямейнага конкурсу органаў унутраных спраў «Сям'я — служым разам», конкурсу МНС «Сямейнае прызванне», конкурсу ў сістэме адукацыі «Гісторыя маёй сям'і». Традыцыйна запланаваны рэспубліканскія акцыі ў радзільных дамах «Павіншуем матулю з малышом», у арганізацыях — «Павіншуем маці і тату разам», у органах ЗАГС бацькоў павіншуюць пры рэгістрацыі шлюбу і нараджэнні дзіцяці, а сямейных юбіляраў — з памятнымі датамі сумеснага жыцця. Учора стартаваў марафон сямейных ролікаў у TikTok «Усё пачынаецца з сям'і», дзе кожны можа далучыцца і расказаць, што адбываецца ў беларускіх сем'ях.

У Полацку 14—15 кастрычніка пройдзе мерапрыемства «Размова пра важнае: шчаслівая сям'я — моцная дзяржава», у Мінску на пляцоўцы мінскага тэхнапарка 17 кастрычніка будзе арганізаваны форум з удзелам працоўнай моладзі «Час сямейных каштоўнасцяў», а 21 кастрычніка — сямейнае свята «З татам разам».

15 кастрычніка адбудзецца Адзіны дзень кансультавання па пытаннях сацыяльнай абароны сямей з дзецьмі, а 14 і 21 кастрычніка адвакаты і натарыусы правядуць бясплатнае прававое кансультаванне па пытаннях шлюбнага сямейнага заканадаўства. Поўны пералік мерапрыемстваў, запланаваных на Тыдзень бацькоўскай любові, можна паглядзець на сайце Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

— Асноўныя мэты нашага святочнага тыдня — аб'яднаць намаганні дзяржавы, усіх жыхароў Беларусі для павышэння прэстыжу мацярынства і бацькоўства і яшчэ раз паклапаціцца пра нашых дзяцей, — адзначыла **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Юлія БЕРДНІКАВА**. — Умацоўваць інстытут сям'і, захоўваць сямейныя каштоўнасці і перадаваць традыцыі — значыць умацоўваць шчаслівую будучыню нашай дзяржавы.

Намеснік міністра падкрэсліла, што сацыяльная арыентаванасць — асаблівасць нашай дзяржавы. Шчаслівая сям'я з'яўляецца адным з прыярытэтаў бягучай пяцігодкі і сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Сёння ў Беларусі рэалізоўваецца комплекс мер для падтрымкі сям'і пры нараджэнні і выхаванні дзяцей, створаны ўмовы для ўдзелу абодвух бацькоў у доглядзе дзяцей. Сацыяльная абарона сям'і, мацярынства і бацькоўства забяспечваецца праз дзяржаўныя дапамогі пры нараджэнні і выхаванні дзяцей, сямейны капітал пры нараджэнні трэцяга і наступнага дзяцей, адрасную сацыяльную дапамогу і сацыяльныя паслугі, гарантыі ў сферы працы, пенсіённым забеспячэнні, жыллёва-крэдытныя адносіны і іншае.

Як адзначыла **начальнік Упраўлення інфармацыйнай палітыкі і ідэалагічнай работы Міністэрства інфармацыі Варвара АЛЕКСАНДРОВІЧ**, ведамства адсочвае, якія каштоўнасці дамінуюць у нашым інфармацыйным полі, і трэнд у медыяполі на сям'ю ўзмацняецца.

— Наша задача — фарміраваць у моладзі разуменне таго, што вялікая сям'я — гэта актуальна, правільна і да гэтага трэба імкнуцца, — падкрэсліла Варвара Александровіч, дадаўшы, што найлепшых журналістаў, якія працавалі над тэмай сям'і, узнагародзяць 21 кастрычніка.

**Алена КРАВЕЦ.**


**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении повторных
электронных торгов по продаже имущества,
принадлежащего
**ОАО «СПЕЦМОНТАЖАВТОМАТИКА»**
(Продавец).

**Электронные торги состоятся 31.10.2025.**

**Лот № 1 в составе:**

**1. Административное помещение** с инв. № 500/D-7022652, 2335,0 кв. м, г. Минск, ул. Могилевская, д. 41, пом. 1.

**2. Кабельная линия 0,4 кВ,** Республика Беларусь, г. Минск, 990, сеть электроснабжения.

**3. Хозяйственно-бытовая канализационная сеть,** Республика Беларусь, г. Минск, 988, канализационная сеть.

**4. Хозяйственно-питьевая водопроводная сеть,** Республика Беларусь, г. Минск, 989, водопроводная сеть.

**5. Пожарная сигнализация.**

**6. Охранная сигнализация.**

**7. Прибор учета тепла с контроллером удаленным ИНДЕЛ** – 1708.

**8. Счетчик холодной воды JS-3.5.**

**9. Зеленые насаждения** (полный список насаждений представлен на электронной торговой площадке «GOSTORG» (далее – ЭТП)).

Административное помещение находится
в капитальном строении с инв. № 500/C-30165,
которое расположено на земельном участке
500000000004002701, 0,3859 га.
Общее долевое право постоянного пользования.
Доля: 79/100.

Обременения: договоры аренды.
Начальная цена с НДС 20 % – 4 411 403,54 руб.
Задаток – 441 141,00 руб.
**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом ЭТП. Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **29.10.2025 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182



ВНИМАНИЮ ПРЕДПРИЯТИЙ, ОРГАНИЗАЦИЙ
И ИНДИВИДУАЛЬНЫХ ПРЕДПРИНИМАТЕЛЕЙ!

**Комитетом государственного имущества Гродненского областного исполнительного комитета проводятся электронные торги по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в собственности Волковысского района**

К ПРОДАЖЕ ПРЕДЛАГАЕТСЯ

**1) Казарма с составными частями и принадлежностями, тепловая сеть, наружная водопроводная сеть, наружная канализационная сеть по адресу: Гродненская область, Волковысский район, Росский сельсовет, городской поселок Россь, улица Красноармейская, 47А.**

Начальная цена лота – 168,00 бел. руб.
Сумма задатка – 42 белорусских рубля.

**Оператор электронной торговой площадки:**
ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа»
Торги проводятся – **05.11.2025** на электронной торговой площадке
«БТУБ-Имущество», **www.et.butb.by**
**Время торгов** устанавливается инструментарием площадки
в автоматическом режиме.
Окончание приема заявлений на участие в торгах
с прилагаемыми к ним документами – 31.10.2025, до 15.00.

Подробная информация по телефонам: **8 (01512) 5 13 44, 2 06 03.**
Дополнительная информация размещена на сайте: **www.et.butb.by**

УНП 500042135



**Брестский филиал**
**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

**Лот № 1. Оборудование: система очистки и рециркуляции воды (ARL/F 1003 B/99), складской номер 19206**

| Начальная цена, руб. (с учетом НДС) | 82 560,00 | Размер задатка, руб. | 8 256,00 |
|---|---|---|---|

**Местонахождение:** Брестская обл., Ганцевичский р-н, г. Ганцевичи, ул. Монтажников, д. 17а. **Продавец:** РУП «Белоруснефть-Брестоблнефтепродукт», 224018, г. Брест, ул. ГОБК, 13, тел./факс 80162270713. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901

**Аукцион состоится 18 ноября 2025 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **www.au.nca.by,** также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-01, 40-87-41**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329, в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 17 ноября 2025 г. до 17.00**



Свидетельство общества с ограниченной ответственностью «ПродХимМаркет» (УНП 591035671) **считать недействительным в связи с утерей.**

УНП 191228804

**Могилевский филиал**
**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
**(организатор аукциона)**
**информирует о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего РУП «Могилевское отделение Белорусской железной дороги» (Продавец) на праве хозяйственного ведения**

**Электронные торги состоятся 30.10.2025 в 11.00 на электронной торговой площадке GOSTORG.BY**

**Лот № 1. Станок деревообрабатывающий С26-2Н,** начальная цена: 5300,00 бел. руб. без учета НДС. **Лот № 2. Станок деревообрабатывающий**, начальная цена: 2 800,00 бел. руб. без учета НДС. **Лот № 3. Станок вертикально-сверлильный ДЭМ-25,** начальная цена: 1 100,00 бел. руб. без учета НДС. **Лот № 4. Заточно-обеспыливающий агрегат,** начальная цена: 1 300,00 бел. руб. без учета НДС. **Лот № 5. Станок деревообрабатывающий ГС-601,** начальная цена: 850,00 бел. руб. без учета НДС. **Лот № 6. Станок деревообрабатывающий ВБ-1,** начальная цена: 4 800,00 бел. руб. без учета НДС. **Лот № 7. Станок токарно-винторезный 1К-625,** начальная цена продажи: 4 800,00 бел. руб. без учета НДС. **Лот № 8. Станок вертикально-сверлильный 2А 125**, начальная цена продажи: 1 700,00 бел. руб. без учета НДС. **Лот № 9. Станок точильно-шлифовальный В3-379-01**, начальная цена продажи: 2 300,00 бел. руб. без учета НДС. **Лот № 10. Станок диленно-реечный с ролико-дисковой подачей ЦА-2А**, начальная цена продажи: 2 600,00 бел. руб. без учета НДС. **Лот № 11. Станок круглопильный универсальный Ц 6-2**, начальная цена продажи: 1 400,00 бел. руб. без учета НДС. **Лот № 12. Станок деревообрабатывающий (фуговальный) СФ-4**, начальная цена продажи: 1 500,00 бел. руб. без учета НДС. **Лот № 13. Станок поперечно-продольный фрезерный ВПФ-038-02**, начальная цена продажи: 2 300,00 бел. руб. без учета НДС. **Лот № 14. Станок абажурно-лобзиковый АЖС-5**, начальная цена продажи: 1 100,00 бел. руб. без учета НДС. **Лот № 15. Станок «КУСОН»-3/1500**, начальная цена продажи: 4 915,28 бел. руб. без учета НДС. **Лот № 16. Станок ленточно-отрезной СЛП-2П**, начальная цена продажи: 1 600,00 бел. руб. без учета НДС. **Лот № 17. Станок деревообрабатывающий УДС-2**, начальная цена продажи: 2 200,00 бел. руб. без учета НДС. **Лот № 18. Грузовой а/м ZIL-131**, начальная цена продажи: 12 800,00 бел. руб. без учета НДС.

**Местоположение: лоты №№ 1–5: г. Могилев, ул. Паровозная, 1а,**
**лот № 6: г. Могилев, ул. Паровозная, 19,**
**лоты №№ 7–9: г. Могилев, ул. Первомайская, 156д;**
**лоты №№ 10–14: г. Слуцк, ул. Вокзальная, 1,**
**лот № 15: г. Слуцк, ул. Вокзальная, 16;**
**лоты №№ 16–17: г. Бобруйск, ул. Привокзальная, 10,**
**лот № 18: г. Могилев, пос. Загорский, 5а.**

Извещение о проведении электронных торгов размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь, Могилевского облисполкома и на торговой площадке GOSTORG.BY. Организатор торгов и оператор ЭТП: **Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»** УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by.

Доп. информацию можно получить по тел.: **+375222-72-41-14, +37529-624-26-25,** на сайте ЭТП **www.gostorg.by**

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки)
информирует
о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **государственному предприятию «НЦОТ»** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 29.10.2025.**

**Лот № 1.** Дизель-генератор в защитном кожухе AKSA AD 275,
инв. № 00272. Год выпуска – 2015 г.
Начальная цена с учетом НДС – 58 536,00 руб.
**Местонахождение:** г. Минск, ул. К. Маркса, 29.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by, Единой базе au.nca.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182

**Брестский филиал**
**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

**Лот № 1. Агрегат электронасосный АДН 900-60 с эл. дв. 200 кВТ, складской номер 14516**

| Начальная цена, руб. (с учетом НДС) | 6 780,00 | Размер задатка, руб. | 678,00 |
| --- | --- | --- | --- |

**Местонахождение:** Брестская обл., Брестский р-н, Знаменский с/с, северо-восточнее н. п. Прилуки. **Продавец:** РУП «Белоруснефть-Брестоблнефтепродукт», 224018, г. Брест, ул. ГОБК, 13, тел./факс 80162270713. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901

**Аукцион состоится 30 октября 2025 г. в 14.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **www.au.nca.by,** также можно узнать по телефонам: **8 (0162)-40-87-01, 40-87-41**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329, в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 29 октября 2025 г. до 17.00**

# ПАЗІТЫЎНЫ ТРЭНД

## Інфляцыя ў Беларусі запавольваецца

Так, аналітыкі банка звяртаюць увагу на той факт, што інфляцыя ў Беларусі запавольваецца ўжо другі месяц запар.
Гэта вынікае са штотыднёвага макраагляду Еўразійскага банка развіцця.

— Рост цэн склаў 7,1 % (год да года) у верасні 2025-га пасля 7,2 % у жніўні, — канстатуецца ў аглядзе.

Спецыялісты банка адзначаюць зніжэнне тэмпаў росту цэн на тавары: па харчовых — да 9,8 % (год да года) у верасні пасля 9,9 % у жніўні, па нехарчовых — да 2,9 % пасля 3,2 % адпаведна. У той жа час, канстатуюць аналітыкі, інфляцыя ў сектары паслуг павялічылася да 7,9 % у верасні пасля 7,7 % у жніўні, тлумачачы гэта ростам рэгуляваных тарыфаў на ЖКП.

— Упершыню адзначана запаволенне ўстойлівага кампанента росту цэн: базавая інфляцыя знізілася да 7,5 % у верасні (7,7 % у жніўні), што сведчыць аб зніжэнні інфляцыйнага ціску, — робяць акцэнт на пазітыўны трэнд аналітыкі ЕАБР.

Дарэчы, паводле звестак Белстата, індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў верасні 2025-га ў параўнанні са жніўнем склаў 100,5 %, са снежнем 2024-га — 105,8 %.

— Базавы індэкс спажывецкіх цэн, які выключае змяненне цэн на асобныя тавары і паслугі, схільныя ўплыву фактараў адміністрацыйнага і сезоннага характару, у верасні 2025 года ў параўнанні са жніўнем 2025-га склаў 100,5 %, са снежнем 2024-га — 106,3 %, — адзначылі ў Нацыянальным статыстычным камітэце.




Крыніца інфаграфікі: Нацыянальны статыстычны камітэт Рэспублікі Беларусь

АКТУАЛЬНА

# ПОПЫТ РАСЦЕ

## Як развіваецца супрацоўніцтва Беларусі з іншымі краінамі ў сферы аховы здароўя і якія медпаслугі карыстаюцца папулярнасцю ў замежнікаў?

Пра гэта ў інтэрв'ю тэлеканалу СТБ распавёў міністр аховы здароўя Аляксандр ХАДЖАЕЎ.



— На сёння маем больш за 70 падпісаных мемарандумаў і пагадненняў з рознымі краінамі. Толькі сёлета падпісалі чатыры значныя дакументы з такімі дзяржавамі, як Іран, Аман, Сербія і В'етнам, — распавёў міністр, дадаўшы, што не так проста заўсёды знайсці агульныя пункты судакранання. — Мы вядзём дастаткова скрупулёзную і значную працу ў пошуках таго, што ўзаемавыгадна. Нават калі бяром тэмы фармацэўтыкі, павінны разглядзець пералік усёй наменклатуры, якая ёсць у нас. Тады прапануем, а калегі ўжо выбіраюць , што ім цікава. Тут, вядома, узнікаюць і дадатковыя пытанні.

Асноўнымі экспартнымі прэпаратамі з'яўляюцца анкалагічныя, супрацьзапаленчыя, рэўматоідныя прэпараты, антыбіётыкі. Часам запатрабаваны больш шырокі асартымент, у іншых выпадках цікавіць пэўная вузканакіраваная тэматыка.

— У цэлым экспартны патэнцыял і экспартнае ўзаемадзеянне з'яўляюцца адным з лакаматываў развіцця нашай галіны, — сказаў міністр.

Ён дадаў, што ўнутры краіны практычна 90 % прэпаратаў, якія выкарыстоўваюцца ў шпітальным сектары, беларускай вытворчасці.



# УРАДЖАЙНАСЦЬ ВЫШЭЙШАЯ ЗА ЛЕТАШНЮЮ

## У краіне намалочана больш за 9,5 мільёна тон збожжа

Паводле аператыўных звестак Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, на 13 кастрычніка з палёў краіны намалочана 9 мільёнаў 541 тысяча тон збожжа разам з рапсам і кукурузай.




У разрэзе абласцей, тысяч/тон:

- Брэсцкая – 1860;
- Віцебская – 1025;
- Гомельская – 1145;
- Гродзенская – 1857;
- Мінская – 2360;
- Магілёўская – 1294.

Збожжавыя і зернебабовыя культуры з кукурузай убраны з 89 % плошчаў, што складае 2067 тысяч гектараў.

Дарэчы, сярэдняя ураджайнасць збожжа (разам з кукурузай) вышэйшая за леташнюю на 4,9 цэнтнера з гектара.

У профільным міністэрстве паведамілі, што харчовага збожжа пастаўлена ў кошт дзяржзаказу 683 тысячы тон – 98 % ад плана.

Кукуруза на сілас і зялёны корм убрана з 70 % плошчаў, што складае 707 тысяч гектараў. Нарыхтавана сена 562 тысячы тон – 78 % плана. Сенажу – 13 мільёнаў 707 тысяч тон – 98 % плана. Сіласу – 14 мільёнаў 923 тысячы тон – 72 % плана. Травяных кармоў – 8 мільёнаў 260 тысяч тон кармавых адзінак – 82 % плана.

Цукровыя буракі ўбраныя з 54 % плошчаў. Накапана 2 мільёны 886 тысяч тон караняплода. Ураджайнасць, адзначаюць спецыялісты, вышэйшая за леташнюю на 52,1 цэнтнера з гектара.

Бульбы накапана 593 тысячы тон.

– Усяго агародніны, вырашчанай у адкрытым грунце, сабрана 124 тысячы тон. Засеяныя плошчы складаюць больш за 8 тысяч гектараў, ужо ўбрана 68 %, – пракаментавалі ў профільным міністэрстве.

Ільнаводчая галіна таксама не будзе адчуваць недахопу ў сыравіне: нарыхтавана льнотрасты 172 тысячы тон ураджайнасцю вышэйшай за леташнюю на 12,9 цэнтнера з гектара.

Што датычыцца сяўбы, то пасеяна азімых збожжавых на зерне на плошчы 1 мільён 439 тысяч гектараў, або 96 % запланаванага: Брэсцкая – 102 %; Віцебская – 85 %; Гомельская – 89 %; Гродзенская – 100 %; Мінская – 100 %; Магілёўская – 96 %.

Паднята зябліва 53 тысячы гектараў, што складае амаль 4 % ад плана ў 1432 тысячы гектараў.



– У нашых аптэках вы можаце ўбачыць парадку 60-65 % прэпаратаў, якія вырабляюцца ў Беларусі. Але тая наменклатура, якая абмяркоўваецца з нашымі партнёрамі, на сёння, вядома, уключае не сотні, чаго б нам хацелася, а гэта пакуль адзінкі, – адзначыў Аляксандр Хаджаеў.

У ліку апошніх прыкладаў – узаемадзеянне з Аманам.

– Мы ўжо рыхтуем пяць рэгістрацыйных дасье для таго, каб прадставіць для рэгістрацыі, і пералік дадатковых больш чым 180 прэпаратаў, якія могуць быць карысныя для аманскіх партнёраў, – распавёў міністр.

– За апошнія пяць гадоў экспарт медыцынскага турызму, медпаслуг вырас у паўтара раза. На сёння ставім перад сабой задачу, каб дадаваць штогод ад 5 % да 10 % па медыцынскім турызме. І пры такіх умовах, вядома, неабходна ў гэтым годзе дасягнуць экспарту ў 50 мільёнаў долараў. Лічба вельмі значная, і на сёння па тых паказчыках, якія ёсць за дзевяць месяцаў, адчуваем, што да яе падыходзім, – расказаў кіраўнік ведамства.

Найбольш запатрабаваны такія кірункі, як транспланталогія, анкалогія, CAR-T-тэрапія. У тым ліку назіраецца станоўчая дынаміка па колькасці грамадзян, якія прыехалі на лячэнне з Польшчы, Літвы, Латвіі.

Аляксандр Хаджаеў звярнуў увагу, што акрамя тых, хто мэтанакіравана прыязджае ў краіну па медыцынскія паслугі, звяртаюцца па дапамогу і турысты. У цэлым у 2024 годзе атрымалі медпаслугі ў Беларусі больш за 160 тысяч замежнікаў з 159 краін.

Гаворачы аб развіцці медыцыны ў рэспубліцы, міністр асабліва адзначыў высокі ўзровень кваліфікацыі беларускіх трансплантолагаў. Таксама добрыя вынікі дасягнуты ў галіне акушэрства і гінекалогіі. Сістэма арганізацыі дапамогі маці і дзецям дастаткова эфектыўна выбудавана.

– І лічбы таксама прызнаюцца нашымі заходнімі партнёрамі, калі гаворым пра прызнанне нашай медыцыны. І павінны сказаць, што ў гэтым аспекце (па кірунку мацярынства і дзяцінства) у нас вельмі добрае ўзаемадзеянне з краінамі СНД, – дадаў міністр.

У прыклад ён прывёў работу з Узбекістанам, дзе спецыялісты дапамагаюць выбудаваць сістэму па гэтым кірунку, падобную да беларускай.

**Па матэрыялах БелТА.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ОАО «Н Холдинг»**
**проводит открытый повторный аукцион по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности**
**ОАО «МПОВТ»**

**Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Н Холдинг» по организации и проведению аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ЛОТ № 1 | Капитальное строение с инв. № 600/С-151686, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/5, район аг. Колодищи. Площадь: 372,5 кв. м. Наименование: Склад. Назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: Одноэтажное смешанной конструкции здание склада. Обременение: аренда.<br>Капитальное строение с инв. № 600/С-182238, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/14, вблизи аг. Колодищи. Площадь: 993,5 кв. м. Наименование: Ангар (инв. № 40389). Назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: 14А1/к-Ангар (инв. № 40389), 1-Пристройка. Обременение: аренда.<br>Капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 623683400001000692, площадью 9,7659 га, предоставленном ОАО «МПОВТ» на праве постоянного пользования (срок действия: не установлен).<br>На земельном участке установлены следующие ограничения (обременения): зона санитарной охраны источников артскважина № 32265/78, площадь 9,7659 га | | | | |
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **789 000,00** | **Задаток, BYN** | **78 900,00** | **Шаг аукциона** | **5 %** |
| **Сведения о продавце, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «МПОВТ»<br>Республика Беларусь,<br>220140, г. Минск, ул. Притыцкого, д. 62<br>Тел. +375 (17) 388 90 99.<br>E-mail: mpovt@mpovt.by | | | | |
| **Сведения об организаторе аукциона** | ОАО «Н Холдинг»<br>220029, г. Минск, пр-т Машерова, 11, пом. 1.<br>Тел. 8 029 754 63 46 (Мария) | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **10 (десяти) рабочих дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона** | Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение 5 (пяти) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона, а также в течение 3 (трех) рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона выплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 3 % от цены продажи предмета аукциона на основании счета, выставленного организатором аукциона. | | | | |
| **Условия оплаты** | Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях (нерезидентами – в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты) не позднее дня подачи заявления на участие в аукционе на следующие банковские реквизиты: р/с BY79 AKBB 3012 0000 1634 1000 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, 220005, г. Минск, пр-т Независимости, 56. Получатель – Открытое акционерное общество «Н Холдинг», УНН 101059240, ОКПО 37392696.<br>Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за объект, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона. | | | | |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе** | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **по 27 октября 2025 года включительно** в рабочие дни с 9.00 до 16.55 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1 | | | | |
| **Место, дата и время проведения аукциона** | Аукцион состоится **28 октября 2025 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, 35-1, зал совещаний ОАО «Н Холдинг» | | | | |

Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время, без объяснения причин, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от проведения аукциона.



**Ликвидатор ООО «ЭффектКонсалт»**
извещает о проведении первых электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего
**ООО «ДронИнвест»**, УНП 193704970,
в форме аукциона

**Продавец:** ООО «ДронИнвест».

**Место проведения торгов:** электронная торговая площадка https://aferta.by/

**Срок подачи заявок:** не позднее 13.11.2025 до 17.00.

**Дата проведения электронных торгов:** 17.11.2025 с 09.00 до 16.00.

**Общие сведения о лотах:**

| № лота | Наименование лота | Начальная цена лота, руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Сельскохозяйственный дрон с дополнительным оборудованием | 167 139,14 |
| 2 | Прицеп ATS500 3500/1800/1700 двухосный с емкостями | 15 761,59 |

Заявления на участие в торгах с приложением платежных документов, подтверждающих внесение задатка, принимаются на сайте https://aferta.by/.

Задаток в размере 10 % от начальной цены лота перечисляется на р/с BY66ALFA30122C59770010270000 в ЗАО «Альфа-Банк», БИК ALFABY2X; получатель – ООО «БелКомиссионер», УНП 193648539.

ЖЫЦЦЁ Ў ЛІЧБАХ

# ЯКАЯ ЯНА, СУЧАСНАЯ МАЦІ?

**Сярэдні ўзрост жанчыны пры нараджэнні першынца — 27,6 года, пры нараджэнні другога і наступных дзяцей — 30,5 года**

Згодна са звесткамі перапісу насельніцтва 2019 года, статыстычны партрэт маці выглядае наступным чынам: гэта замужняя беларуска, якая жыве ў горадзе, выхоўвае дваіх дзяцей, мае вышэйшую або сярэднюю спецыяльную адукацыю.




СТАТЫСТЫЧНЫ ПАРТРЭТ МАЦІ

(ПА ДАНЫМ ПЕРАПІСУ НАСЕЛЬНІЦТВА 2019 Г.)




Як паведамляе Нацыянальны статыстычны камітэт, на пачатак года ў краіне пражывалі 4 047 000 жанчын, з іх 79,3 % жыве ў горадзе, 20,7 % — у вёсцы. Жанчыны складаюць 55,1 % ад агульнай колькасці насельніцтва.

У 2024 годзе шлюб заключылі 46 242 жанчыны. З іх упершыню — 60,9 %, паўторна — 39,1 %. Сярэдні ўзрост уступлення ў шлюб — 26,7 года (пры ўмове што ён першы) і 40,3 года (пры ўмове што паўторны).

Летась колькасць жанчын рэпрадуктыўнага ўзросту (15—49 гадоў) складала 2 103,7 тыс., што 42,9 % ад усіх прадстаўніц жаночай паловы. Большасць з іх пражывае ў гарадской мясцовасці (83,7 %). Сярэдні ўзрост маці пры нараджэнні першынца — 27,6 года, пры нараджэнні другога і наступных дзяцей — 30,5 года.

Сацыяльная палітыка, якая праводзіцца ў краіне, садзейнічае таму, каб у кожнай жанчыны была магчымасць нарадзіць і выхаваць здаровых і шчаслівых дзяцей. Па даных Міністэрства аховы здароўя, у Беларусі налічваецца 162 жаночыя кансультацыі і арганізацыі аховы здароўя, якія маюць у складзе жаночыя кансультацыі. У краіне працуюць 3 049 акушэраў-гінеколагаў: на 10 тысяч жанчын прыходзілася шэсць такіх спецыялістаў. У тым ліку дзякуючы намаганням апошніх 1671 жанчына ў 2024-м стала маці ў выніку прымянення метаду экстракарпаральнага апладатварэння, што на 279 больш у параўнанні з 2023-м.

## Тым часам

21 кастрычніка ў Беларусі адзначаецца Дзень бацькі. На пачатак 2025 года на тысячу жанчын 18 гадоў і старэйшых прыходзілася 815 мужчын той жа ўзроставай групы. Пры гэтым ва ўзросце 18—39 гадоў на тысячу жанчын прыходзілася 1 011 мужчын.

«У мінулым годзе ў шлюб уступілі 46 242 мужчыны, — паведаміла **начальнік галоўнага ўпраўлення дэмаграфічнай статыстыкі і перапісу насельніцтва Нацыянальнага статыстычнага камітэта Ірына БІЧАН.** — З іх 29 776 мужчын (64,4 %) стварылі сям'ю ўпершыню. Сярэдні ўзрост уступлення ў першы шлюб склаў 28,9 года, паўторны — 43,1 года».

Летась у эканоміцы былі занятыя 2 232 000 жанчын ва ўзросце ад 18 да 58 гадоў. 48 % з іх мелі непаўналетніх дзяцей.

56,9 % занятых у эканоміцы жанчын выхоўвалі адно дзіця, 33 % — дваіх, 10,1 % — траіх і больш.

Сярод кіраўнікоў гэтай узроставай катэгорыі летась значыліся 50,5 % жанчын. Прычым 47,4 % з іх мелі непаўналетніх дзяцей.

Выбарачныя даследаванні дамашніх гаспадарак, праведзеныя з красавіка 2024 года па сакавік 2025 года, дазволілі сфармуляваць наступныя высновы. У сярэднім мамы трацяць на догляд за дзецьмі 2 гадзіны 16 хвілін у дзень — гэта 9 % ад свайго сутачнага часу. 1 гадзіну 15 хвілін займае фізічны догляд за дзецьмі, 1 гадзіну 1 хвіліну мамы праводзяць за іх навучаннем і выхаваннем.

### Шлюб і сям'я у 2024 годзе




### Занятасць жанчын ва ўзросце 18—58 гадоў у 2024 годзе*




* Даныя выбарачнага абследавання хатніх гаспадарак у мэтах вывучэння праблем занятасці насельніцтва.

**Веранiка КАНЮТА.**

**Крыніца інфаграфікі: Нацыянальны статыстычны камітэт Рэспублікі Беларусь.**

# УВАСОБЛЕНАЯ ЖАНОЦКАСЦЬ

**Шматдзетная маці на сцэне ў беларускіх танцах — мастацтва і рэальнасць**

Марына Ходак — прыгожая маладая мама (інакш не скажаш, пабачыўшы яе). І мала хто адразу паверыць у тое, што ў гэтай вытанчанай жанчыны пяцёра дзяцей. У 2022 годзе яна была ўзнагароджана ордэнам Маці, вельмі хвалявалася, калі атрымлівала яго з рук Прэзідэнта — гэта высокая адзнака вялікай часткі яе жыцця. Але ўжо тады, падчас урачыстасцяў, калі стаяла на сцэне Палаца Рэспублікі, яна адчувала, што жадае вярнуцца на любімую працу. На сцэну! Там што яна прафесійная артыстка, вельмі хоча, умее і можа паказваць харастко беларускіх танцаў. Здавалася б, гэта дзве часткі яе жыцця, але ж ёсць у іх невідавочнае супадзенне: у нашай культуры (у тым ліку танцавальнай) значны вобраз жанчыны — прыгажуні, каханай, маці, працаўніцы, гаспадыні... Гэта вобраз, на якім трымаецца сям'я.

## ЖЫЦЦЁВЫ ВЫБАР

Кар'ера ці сям'я і дзеці? Вось выбар, якія звычайна стаяў перад прадстаўніцамі харэаграфічнага мастацтва — балерынамі, танцоркамі. Марына адна з тых, хто не падуладны стэрэатыпам, і пры выбары давала сабе адназначны адказ: і тое, і тое! Прайшлі часы, калі трэба нечым ахвяраваць, пры жаданні можна паспець усё. Шматдзетныя мамы, напрыклад, паспяхова танцуюць на сцэне Вялікага тэатра Беларусі, нават з'яўляюцца прымамі-балерынамі — на іх паспяхова трымаецца вялікая частка рэпертуару. Яны, дарэчы, вучыліся на паралельным патоку з Марынай, але асвойвалі класічны танец. Яна ж у Беларускі дзяржаўны харэаграфічны каледж паступіла ў эксперыментальны клас, калі толькі адкрывалася народнае аддзяленне. Абрала яго свядома, таму што ў сталічнай школе № 168 ёй прывіла танцавальную культуру выкладчыца Жанна Міхайлаўна Тарасава, якая захапіла менавіта народнымі танцамі. Наогул, дзяўчынка танцавала з чатырох гадоў, іншага шляху для сябе не бачыла. Пры тым што яе бацькі былі вельмі далёкія ад творчых прафесій, яны разумелі: дачцэ гэта патрэбна і, галоўнае, у яе атрымліваецца.

**Яшчэ падчас вучобы ў каледжы Марына праходзіла практыку ў Беларускім дзяржаўным ансамблі танца, сюды ж прыйшла працаваць па размеркаванні, нейкі час нават атрымлівала прэзідэнцкую стыпендыю. Працаваць у дадзеным выпадку — значыць танцаваць. І нібыта ўсё проста, але ці часта мы задумваемся пра тое, што фактычна гэта цяжкая фізічная праца? Але ж якое ў ёй харастко!.. І дзяўчаты-прыгажуні на сцэне — само ўвасабленне кахання і жыццялюбства. Марына стала мамай упершыню ў 20 гадоў. Пасля нараджэння сыночка Ільі хутка аднавілася і вярнулася на працу: рэпетыцыі, танцы, канцэрты, гастролі...**

— Мне дзіўна чуць, што хтосьці штосьці не паспявае з адным дзіцем, — гаворыць Марына Мікалаеўна. — Асабліва цяпер, калі іх у мяне пяцёра. Але калі любіш, то пастараешся арганізаваць сваё жыццё так, каб на ўсё хапала часу. І каб пра сябе як асобу не забываць. У мяне атрымалася так, што другое дзіця — дачушку Сашку — я нарадзіла ў 33 гады, пасля хутка з'явілася Сафія, а чацвёрты раз з радзільні мы прывезлі двайнят Настассю і Рыгорку. За час дэкрэту я вельмі засумавала па працы — вярталася ў ансамбль з задавальненнем. У мяне з'явіўся танцавальны голад. Скажу больш: мой жаночы досвед, пачуцці, якія дае мацярынства, адкрылі больш глыбокае разуменне нейкіх рухаў і беларускіх танцаў. Бо на сцэне трэба ўвасабляць вялікую палітру самых розных эмоцый — а я ведаю, што за імі стаіць.



Да сямейнага шчасця Марына і Сяргей ішлі праз няпросты выбар. Так бывае, калі, знайшоўшы жанчыну, з якой хочаш пражыць жыццё, выбіраеш і краіну, дзе жыць разам і нараджаць дзяцей. Ён скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, доўгі час працаваў у Парыжы, меў намер з'язджаць. Але нарадзілася дзіця — і Сяргей зразумеў: трэба быць побач з каханай. Адсек сувязі там, а тут знайшоў сабе новы занятак, каб забяспечваць сям'ю — паставіў яе на першае месца. Тады яшчэ яны нават не думалі, што сям'я так разрасцецца. Але адразу вырашылі, што адным дзіцем не абмяжуюцца: муж Марыны сам вырас у шматдзетнай сям'і. І ён вельмі хацеў мець сыночка Рыгора...

## ПРАФЕСІЙНАЯ ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦЬ

Малодшыя — двайняткі Рыгор і Настасся — цяпер ходзяць у садок, а ўжо рыхтуюцца да школы. Цяпер удзельнічаюць у Рэспубліканскім конкурсе даследчых прац дзяцей дашкольнага ўзросту «Я — даследчык». У нядзелю занятыя ў студыі малявання. Дзевяцігадовая Сафія займаецца ў секцыі «Лыжныя гонкі», удзельнічае ў спаборніцтвах. Акрамя таго, танцуе ў заслужаным дзіцячым калектыве «Гарэзлівыя агеньчыкі». Дванаццацігадовая Саша вучыцца ўжо ў сёмым класе і займаецца музыкай, з задавальненнем іграе на... саксафоне. Нават заняла другое месца на конкурсе «У рытме джаза». Творчым развіццём дзяцей займаецца мама. У той час як тата больш увагі ўдзяляе агульнаадукацыйным прадметам — матэматыцы, фізіцы, англійскай мове і знаходзіць час, каб дапамагчы з імі. А старэйшы сын Ілья заканчвае інстытут і цяпер жыве асобна — ён ужо мае сваю сям'ю.

Шматдзетным бацькам дапамагла дзяржава: атрымалі кватэру, скарыстаўшыся сямейным капіталам, узялі крэдыт. Харчаванне для школьнікаў бясплатнае, што таксама добрая падтрымка. Але мама далёкая ад думкі, што можа дазволіць сабе раскошу не працаваць. Дзяржава і ў гэтым жаданні падтрымлівае, нават афіцыйна прадугледжвае адзін дзень у тыдзень, калі мама можа займацца сямейнымі справамі, — гэта насамрэч цудоўна. Тым больш што пры добрай арганізацыі працы гэты «сямейны» дзень не адбіваецца на творчай форме Марыны. І ёсць яшчэ чатыры, калі яна можа выконваць свае прафесійныя абавязкі.

Вядома, нараджэнне дзяцей адцягнула яе выхад на прафесійную пенсію — для гэтага трэба 20 гадоў канцэртнай дзейнасці. Таму Марына ў свае 46 гатовая працаваць яшчэ некалькі гадоў, стараецца трымаць сябе ў форме.

— Бывае, што і пасля нараджэння першага дзіцяці некаторыя дзяўчаты не могуць вярнуцца на сцэну і застацца ў калектыве. Мне пашчасціла з прыроднай канстытуцыяй. Добра, што я не надта схільная набіраць вагу, без праблем змагла аднавіць форму, тым больш што ёсць такое паняцце, як «мышачная памяць», што аблягчае вяртанне ў нашу прафесію. Мне не надта трэба сябе стрымліваць у харчаванні, я гатую на ўсю сям'ю адразу, не раблю для сябе нейкіх адмысловых страў. Проста, калі разумею, што трэба крыху стрымацца, магу звечара адмовіцца ад вячэры. Калі ведаеш, дзеля чаго, то гэта не праблема. Я люблю танцаваць і хачу быць на сцэне часцей.

Яна пералічвае танцы (найбольш падабаюцца меладычныя, як «Арэлі»), дзе яна працавала сола: «Церніца», «Каханачка», цікавы ігравы нумар «Кадрыля на зэдліках», а яшчэ вельмі прыгожы «Авэ Марыя» — як падзяка жанчыне-маці, праз якую будзе ўратаваны свет. І як жа хораша, што са сцэны Беларускі дзяржаўны ансамбль танца паказвае прыклад такой пашаны. Гонарам для калектыву, які сваімі творамі ўслаўляе жаноцкасць, напэўна, з'яўляецца праца ў ім артысткі, якая мае ордэн Маці. Вось вам і доказ, што сцэнічнае жыццё — не проста прыгожая мастацкая ідэя, але і адлюстраванне рэальных адносін і павагі да жанчыны-маці.

Так, танцавальная сфера няпростая, цяпер у калектыве шмат маладых артыстак, якія таксама хочуць сябе паказаць. Але ў наш час разуменне «маладосць жанчыны» адноснае. Тым больш што нараджэнне дзяцей абуджае жаночы арганізм, надае яму сілы і адначасова дзівосную пяшчоту. І мудрасць. Яна таксама патрэбна для добрага мастацтва. А гэта тое, што выспявае гадамі. І гэта тое, што не кожны мае і можа ўвасобіць адразу. Ці не такі вобраз жанчыны — прыгожай і неабыякавай, клапатлівай і разумнай — мы павінны паказваць як прыклад са сцэны?..

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# ПРАВАДНІК У СВЕТ ДЗЯЦІНСТВА

**У Нацыянальнай бібліятэцы ўрачыста адкрыўся выставачны праект «Святло бацькоўскага сэрца», прымеркаваны да Тыдня бацькоўскай любові**

Як заўважыў намеснік генеральнага дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Віктар Пшыбытка, гэта выстаўка стваралася з мэтай нагадаць пра важнасць сям'і, выхавання, клопату, і калі пасля яе наведвання гасцям захочацца выказаць бацькам падзяку за падораны цікавы і захапляльны свет дзяцінства, значыць, праект атрымаўся.

Выстаўка будзе цікавай прадстаўнікам розных узростаў. Так, юныя наведвальнікі змогуць убачыць кнігі, з якімі раслі і на якіх выхоўваліся іх бацькі і бабулі з дзядулямі. Прадстаўнікі старэйшага пакалення згадаюць, колькі цікавых адкрыццяў падарыў ім кніжны свет, сумеснае сямейнае чытанне.

Маладыя бацькі і студэнты, якія прыйшлі на адкрыццё выставачнага праекта, былі ўражаны кнігамі з рухомымі элементамі 1920-х гадоў. Сярод такіх была кніжка Карнея Чукоўскага — з тэлефонным дыскам. Высветлілася, што ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі маюца кніжкі-цацкі нават XVIII стагоддзя.

Падчас падрыхтоўкі экспазіцыі бібліятэкары выявілі выданні з папяровымі гульнямі. Яны адсканавалі незвычайны альбом 1945 года «Кніжны кіёск», разрэзалі на дэталі і сабралі з іх папяровую карусель з маленькімі кніжкамі, у кожнай з якой — творы знакамітых пісьменнікаў. Такі незвычайны праект кніжкі-выразанкі пад кіраўніцтвам Самуіла Маршака быў падрыхтаваны для маленькіх чытачоў, якія перажылі вайну. Для іх праводзілася вялікае кніжнае свята. Былі запрошаны дзеці з усяго Савецкага Саюза...

У экспазіцыі і дзіцячыя часопісы, у тым ліку і экзэмпляры, якім больш за сто гадоў. Ёсць тут і самыя першыя беларускія выданні. У адной з вітрын побач з «Першым чытаннем для дзетак беларусаў», падрыхтаваным Алаізай Пашкевіч, можна пабачыць і самы ранні беларускі дзіцячы часопіс «Лучынка». Яго таксама выдавала Цётка. Праўда, выйшла ўсяго толькі шэсць нумароў.



Прадстаўлены і дзіцячыя буквары. Сярод іх — і гонар Нацыянальнай бібліятэкі — факсімільнае выданне першай у свеце кнігі з назвай «Буквар», якая пабачыла свет у 1618 годзе ў друкарні Віленскага Свята-Духава праваслаўнага брацтва. Захавалася ўсяго два арыгінальныя асобнікі: адзін — у Каралеўскай бібліятэцы Даніі, другі — у Лондане. Дзякуючы факсімільнаму ўзнаўленню, зробленаму да 400-годдзя беларускага буквара, сёння і ў нашай краіне можна пазнаёміцца з гэтым кніжным помнікам. У экспазіцыі і факсіміле яшчэ аднаго знакамітага буквара Спірыдона Собаля.

Выстаўка паказвае, як мяняліся кніжкі. Напрыклад, можна параўнаць, як афармляліся «Прыгоды Гулівера» ў XIX і XX стагоддзях, як сціпла выглядалі першыя беларускія дзіцячыя кніжкі і якімі яскравымі яны сталі ў наш час. Можна пабачыць адно з першых выданняў «Новай зямлі» Якуба Коласа, яго факсімільнае ўзнаўленне і сучасныя выдавецкія праекты, калі паэма класіка прадстаўлена серыяй з невялікіх багата аздобленых кніг, кожная з якіх змяшчае частку твора, звязаную з пэўным сезонам года.

Выставачны праект бібліятэка рыхтавала сумесна з Беларускім саюзам мастакоў і Нацыянальнай кінастудыяй «Беларусьфільм», таму тэматычную кніжную выстаўку дапаўняе экспазіцыя жывапісу, скульптуры.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

# НА СТАРОЙ ПЛЯЦОЎЦЫ — ІНАВАЦЫЙНАЯ

## У Крычаве ў рамках праграмы «Адзін раён — адзін праект» стварылі вытворчасць па выпуску запатрабаваных будматэрыялаў

**Асаблівасць гэтай вытворчасці ў тым, што яна размешчана на плошчах старога цэмзавода і стала своеасаблівым працягам той дзейнасці, якая там вялася. Пераемнікам з'яўляецца прыватнае прадпрыемства ТАА «КМБ-Усход», кіруе якім малады амбіцыйны жыхар Крычава Станіслаў СІВАКОЎ. Запуск новай вытворчасці адбыўся ў рамках праграмы «Адзін раён — адзін праект». Сёлета гэты праект запушчаны і набірае абароты.**



«Я, лічы, прадаўжальнік дынастыі, мае бацькі працавалі на цэмзаводзе, і я, калі вярнуўся з арміі, яшчэ паспеў там папрацаваць. Вельмі перажываў, калі дзейнасць завода стала згасаць, — расказвае Станіслаў Сівакоў, пакуль мы ідзём да інавацыйнай пляцоўкі. — Па сутнасці, мы рэанімавалі тут вытворчасць шыферу, але на сучасным узроўні. Для мяне гэта было яшчэ і справай гонару».

Калі праходзім цераз заводскі мосцік у цэху, пад якім знаходзіцца старое абсталяванне, мой гід заўважае, што яно да нядаўняга часу яшчэ працавала, «КМБ-Усход» выпускаў тут шыфер па старой тэхналогіі. Яшчэ адна такая лінія побач была разабрана і на яе месцы змантравана новая — высокатэхналагічная. «Пляцоўка была падрыхтавана сваімі сіламі, работнікі, якія гэтым займаліся, цяпер працуюць на новым абсталяванні, — расказвае суразмоўца. — Спачатку планавалі ставіць еўрапейскае, але пачаліся санкцыі, і мы пераарыентаваліся на кітайскіх партнёраў. Ездзіў у Кітай, каб выбраць найбольш надзейны варыянт, асабіста прымаў лінію. Спадзяюся, што ў партнёрах не памыліўся. Самае галоўнае — гэта якасць абсталявання. Яно павінна надзейна працаваць не адзін год».



Сёлета новая лінія была запушчана, а старая прыпынена. Але, як запэўнівае дырэктар, калі ў краіне здарыцца будаўнічы бум, старую можна будзе таксама запусціць.

Сёння «КМБ-Усход» лічыцца ў краіне вядучым вытворцам фібрацэментнага шыферу. Прадпрыемства працуе па замкнёным цыкле, без перапынку — кругласутачна. Работа вядзецца ў некалькі змен — людзі кантралююць аўтаматызаваныя працэсы і задзейнічаны на прыёмцы-адгрузцы гатовай прадукцыі.

Працуе прадпрыемства і на імпартазамяшчэнне. Адзін з відаў запатрабаванага на будоўлях шыферу раней завозіўся ў Беларусь з Расіі. Цяпер яго з поспехам робіць «КМБ-Усход». «Сфера яго прымянення неабмежаваная, — сцвярджае кіраўнік прадпрыемства. — Пачынаючы ад будаўніцтва гаражоў, перагародак, сцен і збудаванняў па каркаснай тэхналогіі да афармлення кветнікаў, градак, кампосных ям, дарожак...»

На дасягнутым ў Крычаве не спыняюцца — запускаюць вытворчасць сайдынгу «пад дрэва», які ў краіне ніхто не вырабляе. На чарзе — фібрацэментная чарапіца. Пакуль доследныя экзэмпляры можна ўбачыць толькі ў кабінеце дырэктара. Але хутка ўсё гэта стане на паток. «Дзякуй дзяржаве за тыя прэферэнцыі, якія дае 235-ы ўказ па развіцці паўднёва-ўсходняга рэгіёна, — гаворыць Станіслаў Сівакоў. На першапачатковым этапе мы былі вызвалены ад выплаты падатку на прыбытак, што дазволіла сфарміраваць капітал для мадэрнізацыі. Плюс ільготы па падаходным падатку для людзей, іншыя льготы. Гэтымі прэферэнцыямі мы актыўна карысталіся як зноў утворанае прадпрыемства. І гэта была сур'ёзная падтрымка для нас».

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіва Станіслава СІВАКОВА.**
*г. Крычаў.*

### У тэму

**Намеснік старшыні Крычаўскага райвыканкама Наталля АСМАЛОЎСКАЯ:**

— Праектам, які рэалізоўвала ТАА «КМБ-Усход», прадугледжвалася мадэрнізацыя дзеючай шыфернай вытворчасці, будаўніцтва новай тэхналагічнай лініі, устаноўка абсталявання для вытворчасці фібрацэментных панэляў. Сёння тут выпускаюцца запатрабаваныя ў краіне і за яе межамі будматэрыялы. У вытворчасці прымяняецца інавацыйная рэзка вадой, у выніку чаго атрымліваецца высокая якасць прадукцыі. Пастаўкі ідуць на ўнутраны рынак і ў Расію. Прадпрыемства перспектыўнае і, што асабліва прыемна, цалкам беларускае. Спачатку інвестары арандавалі памяшканне, затым набылі яго. Інавацыйная вытворчасць стабільна развіваецца за кошт крэдытных рэсурсаў і ўласных сродкаў.


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ЗАО «Альфа-Банк», 220013, г. Минск, ул. Сурганова, 43-47 |

| № п/п | Наименование предмета электронных торгов, расположенных по адресу: г. Минск, ул. Макаенка, 11 | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | Машино-место № 380, инв. номер 500/D-978829827, общей площадью 17,9 кв. м | 14 814,29 |
| 2 | Машино-место № 384, инв. номер 500/D-978829842, общей площадью 13,0 кв. м | 18 803,34 |
| 3 | Машино-место № 385, инв. номер 500/D-978829845, общей площадью 13,0 кв. м | 18 803,34 |
| 4 | Машино-место № 410, инв. номер 500/D-978829948, общей площадью 12,7 кв. м | 18 803,34 |
| 5 | Машино-место № 418, инв. номер 500/D-978829979, общей площадью 13,0 кв. м | 18 803,34 |
| 6 | Машино-место № 420, инв. номер 500/D-978829984, общей площадью 13,0 кв. м | 18 803,34 |
| 7 | Машино-место № 421, инв. номер 500/D-978829988, общей площадью 13,0 кв. м | 18 803,34 |
| 8 | Машино-место № 556, инв. номер 500/D-978829881, общей площадью 17,8 кв. м | 14 741,71 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB301200 48350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638.

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **6 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 13.08.2025 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 30.10.2025 г. с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **29.10.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 373 21 33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

**Могилевский филиал**
**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
**извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего**
**ОАО «Могилевоблавтотранс»**

**Электронные торги состоятся 14.11.2025 в 11.00 на электронной торговой площадке GOSTORG.BY**

**Лот № 1. Грузовой седельный тягач VOLVO FH,**

кузов (рама) № YV2AS02A18A670771, р/з – АВ 1426-6, г. в. – 2008.
**Начальная цена продажи: 84 360,00 бел. руб. с учетом НДС.**
**Сумма задатка: 8 436,00 бел. руб.**

**Лот № 2. Полуприцеп бортовой тентовый SCHWARZ MUELLER J203,**

кузов (рама) № VAVJ20339BD312272, р/з – А 3776 А-6, г. в. – 2011.
**Начальная цена продажи: 29 160,00 бел. руб. с учетом НДС.**
**Сумма задатка: 2 916.00 бел. руб.**

**Местонахождение:** г. Могилев, ш. Гомельское, 3.

Р/с для перечисления задатка BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код назначения платежа 40901. Срок подачи документов для участия в торгах: по 12.11.2025 до 12.00.

Порядок оформления участия в торгах, порядок их проведения, а также определения лица, выигравшего торги, и порядок оплаты вознаграждения содержатся в информации о проведении торгов, опубликованной на сайте Организатора торгов GOSTORG.BY.

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за 3 дня до даты торгов. Срок заключения договора купли-продажи: 10 рабочих дней с даты торгов.

Извещение также размещено на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь, и на торговой площадке GOSTORG.BY. Организатор торгов и оператор ЭТП: **Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»,** УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by.

Доп. информацию можно получить по тел**: +375222-72-41-14, +37529-624-26-25,** на сайте ЭТП **www.gostorg.by**

**ЗАО «Центр промышленной оценки»** (УНП 191021390) – проводит электронные торги в форме открытого аукциона по продаже **оборудования (емкости), бывшего в употреблении,** принадлежащего **ОАО «Климовичский ликеро-водочный завод»** (Антикризисный управляющий – ООО «СтанИБор» (УНП 491343813) – производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 111-2/Б/2017).
С порядком регистрации для участия в торгах, общими правилами проведения можно ознакомиться на www.bankrot.gov.by либо на ЭТП «ИПМ-Торги» (ipmtorgi.by) и по тел. +375 29 821-47-15.
**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 13.11.2025 с 09.00 до 16.00.**
Заявки на участие в электронных торгах принимаются с 9.00 14.10.2025 по 12.11.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

ПЕРАДСВЯТОЧНАЕ

# ВЕРА, ПРАНЕСЕНАЯ ПРАЗ СТАГОДДЗІ

## Што рыхтуе Лаўрышаўскі манастыр да свайго 800-годдзя?

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191 021 390, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | Копыльское райпо, г. Копыль, пл. Ленина, 21 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191 224 638, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by**) |
| **Предмет электронного аукциона** | |
| **Лот № 1** | |
| **Магазин «Слуцкий край» 361,5 кв. м** (инв. № 642/С-11416). Адрес: **Минская обл., Копыльский р-н, г. Копыль, ул. Партизанская, д. 1Б.** ***Сведения о земельном участке***: пл. **0,0422 га,** предоставлен на праве аренды (срок действия: по 08.11.2041) для размещения объектов розничной торговли. Ограничения прав на зем. участок: природные территории, подлежащие спец. охране | |
| **Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 175 000,00 бел. руб.** (снижена на 33 %) | |
| **Лот № 2** | |
| **Универмаг «Криница» 975,3 кв. м** (640/D-63459). Адрес: **Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Ленина, 185-49.** ***Сведения о земельном участке***: пл. **0,2190 га,** предоставлен продавцу на праве долевой аренды (доля: 1/5, срок действия по 16.08.2073) для содержания и обслуживания здания многоэтаж. жил. дома с магазином. ***Обременение*****:** площади универмага частично сданы в аренду | |
| **Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 2 690 000,00 бел. руб.** (снижена на 7 %) | |
| **Лот № 3** | |
| **Магазин 102,6 кв. м** (инв. № 642/С-42334, составные части: сарай). Адрес: **Минская обл., Копыльский р-н, Бобовнянский с/с, д. Калиновка 2, ул. Советская, 1А.** ***Сведения о земельном участке***: пл. **0,1249 га** предоставлен на праве аренды (срок действия: по 11.02.2035) для строительства и обслуживания магазина. Ограничения (обременения) прав на зем. участок: охран. зоны электрич. сети (0,0040 га) | |
| **Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 5 000,00 бел. руб.** (снижена на 67 %) | |
| **Задаток по лоту №№ 1, 3 – 10 %, по лоту № 2 – 1 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов:** в течение **30 (тридцати)** дней после подписания договора купли-продажи. По лоту предусмотрено предоставление рассрочки платежа сроком до 2 месяцев с момента заключения договора купли-продажи при первоначальном взносе в день подписания договора в размере не менее 50 % от цены продажи с учетом внесенного задатка | |
| **Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах** | |
| Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (ipmtorgi.by). Победителем аукциона признаётся участник, предложивший максимальную цену | |
| Победитель торгов либо единственный участник, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение по лоту № 1 – 4 %, по лоту № 2 – 2 %, по лоту № 3 – 10 % от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов | |
| Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда»: по лотам №№ 1, 2 – 05.09.2025, по лоту № 3 – 27.08.2025 | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: 17.11.2025 с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов. **Заявки на участие принимаются по 14.11.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| **Контактные данные: +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by** | |

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже движимого имущества**

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов **№ 2025.Г.002.00242** по продаже имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by.

**Продавец:** Витебский областной комитет природных ресурсов и охраны окружающей среды, 210029, г. Витебск, ул. Правды, д. 26А, тел.: 8 (0212) 247440, 247459.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63; e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения торгов: 28.10.2025 в 09.00** (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Автомобиль LADA 21214-120-40, 2012 года выпуска, регистрационный номер 8397 EI-2, тип ТС – легковой специальный (Джип), кузов (рама) №XTA212140C2088587, цвет – синий, инвентарный № 01510285, пробег – 206193 км. Местонахождение предмета электронных торгов: г. Россоны, ул. Советская, д. 4. **Начальная цена**: 4050,00 бел. руб. без НДС. **Задаток:** 405,00 бел. руб.

**Лот № 2.** Автомобиль LADA 21214-120-40, 2012 года выпуска, регистрационный номер 6153 EE-2, тип ТС – легковой специальный (Джип), кузов (рама) № XTA212140C2087125, цвет – темно-бордовый, инвентарный № 01510286, пробег – 188321 км. Местонахождение предмета электронных торгов: Витебская область, г. Чашники, ул. Советская. д. 10/1. **Начальная цена**: 4500,00 бел. руб. без НДС. **Задаток:** 450,00 бел. руб.

**Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 27.10.2025.** Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: +375336958047, Варатынский Алексей Леонидович – лот № 1, +375336958054, Черноусов Юрий Васильевич – лот № 2. С подробной информацией о предмете торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by, в разделе: транспорт – легковые автомобили. Извещения о проведении электронных торгов опубликованы на официальных сайтах Государственного комитета по имуществу **https://au.nca.by** (№ 33863), Витебского областного исполнительного комитета: **https://vitebsk-region.gov.by**

СТАЛІЧНЫ ЧАС

# ТРЫ ПАРКОВАЧНЫЯ ЗОНЫ, ПЕРШЫЯ 15 ХВІЛІН БЯСПЛАТНА

**Вызначаны новыя правілы для платных парковак у Мінску. Паглядзелі, як гэта працуе**

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 27 мая падпісаў Указ № 218, якім уносяцца змены ва Указ ад 3 кастрычніка 2006 года № 589 «Аб упарадкаванні работы аўтамабільных стаянак і аўтамабільных парковак». Тры месяцы было дадзена на тое, каб ён уступіў у сілу і ўсе неабходныя дакументы былі падрыхтаваны. 28 жніўня ён пачаў дзейнічаць. Ва ўказе былі вызначаны асноўныя кірункі работы аўтамабільных стаянак і аўтамабільных парковак. У яго развіццё таксама падрыхтавана пастанова Савета Міністраў № 488 ад 9 верасня. Гэтыя дакументы дазваляць арганізаваць работу платных аўтамабільных парковак, у тым ліку аўтамабільных стаянак па-новаму.

## ЯК МЕНАВІТА?



Цяпер парадак работы аўтамабільных стаянак і аўтамабільных парковак вызначаецца правіламі арганізацыі будаўніцтва і эксплуатацыі, вызначанымі Саветам Міністраў. З'явіліся новыя тэрміны і паўнамоцтвы, у асноўным у мясцовых органаў улады. Акрамя таго, у выпадку фіксацыі неўнясення або ўнясення не ў поўным аб'ёме, а таксама несвоечасовага ўнясення платы за паркоўку гэта з'яўляецца падставай для спагнання з карыстальніка платнай аўтамабільнай паркоўкі дадатковай платы — **1 базавай велічыні** (42 рублі).

У развіццё гэтых дакументаў падрыхтаваны і зацверджаны праект рашэння Мінскага гарвыканкама. Паводле яго, мясцовымі органамі ўлады было вызначана, якія дзяржаўныя ўстановы будуць з'яўляцца аператарам, час бясплатнага знаходжання, месца размяшчэння платных аўтамабільных парковак, памер платы за іх, памер дадатковай платы ў выпадку неўнясення платы за паркоўку або ўнясення не ў поўным памеры.

У сталіцы праблема стаянак і парковак усё ж найбольш актуальная, асабліва існуе перанасычэнне транспартам цэнтральнай часткі горада, што прыводзіць да ўтварэння затораў, аварыйнасці і нават пагаршэння экалогіі. Платныя паркоўкі ў сваю чаргу закліканы знізіць транспартную нагрузку. Таму, паводле слоў **генеральнага дырэктара ГА «Гаражы, аўтастаянкі і паркоўкі» Андрэя ЗЫРАНАВА**, пастараліся максімальна хутка падрыхтаваць адпаведнае рашэнне, каб горад мог пачынаць работу ў гэтым кірунку.

## ШТО ЗМЯНІЛАСЯ?

Устаноўлена, што дзяржаўная ўстанова «Паркоўкі сталіцы» — аператар аўтамабільных парковак на тэрыторыі Мінска.

Час бясплатнага знаходжання транспартнага сродку на платнай аўтамабільнай паркоўцы складзе 15 хвілін (і на адкрытай, і на закрытай).

**АКРАМЯ ТАГО, ВЫЗНАЧАНЫ ТРЫ ПЛАТНЫЯ ПАРКОВАЧНЫЯ ЗОНЫ:**

- Зона 1 (чырвоная зона) — самы цэнтр: Верхні горад, Траецкае прадмесце, Замкавая вуліца.
- Зона 2 (жоўтая зона) — мяжа першага транспартнага кальца.
- Зона 3 (зялёная зона) — у межах другога транспартнага кальца.

Адрозніваюцца яны будуць тарыфамі. Самыя запатрабаваныя паркоўкі, што ў чырвонай зоне, будуць каштаваць даражэй за астатнія.

## А ШТО КАЛІ НЕ АПЛАЦІЦЬ?

Фіксаваць неплацельшчыкаў будуць з дапамогай аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы ДАІ, а дапамагаць будуць і пешыя спецыялісты ў тым ліку. У дачыненні такіх уласнікаў сфарміруюць прэтэнзіі, матэрыялы накіруюць для рэагавання. Калі рэакцыі не будзе — іскавую заяву перададуць у суд для прыняцця рашэння. У гэтым выпадку неабходна пакрыць аплату паркоўкі, 1 базавую велічыню (42 рублі) за несвоечасовую плату, а таксама судовыя выдаткі.

**КОШТ ПЛАТНЫХ ПАРКОВАК СКЛАДЗЕ:**

1. Верхні горад — 7 рублёў за ўезд у першую гадзіну і 3 рублі паўторна. Траецкае прадмесце і Замкавая — 2 рублі ў гадзіну.
2. У жоўтай зоне гадзіна знаходжання таксама будзе каштаваць 2 рублі з 08.00 да 20.00. А з 20.00 да 08.00 — бясплатна.
3. У зялёнай зоне — 1 рубель у гадзіну. Знаходжанне пасля 20.00 будзе таксама бясплатным.

Асноўная задача — максімальна эфектыўна выкарыстоўваць існуючыя парковачныя месцы там, дзе яны найбольш запатрабаваныя.

Як расказаў **дырэктар ДУ «Паркоўкі сталіцы» Міхаіл ФІЛІПАЎ**, як правіла, атрымаўшы прэтэнзію, 90 % карыстальнікаў платных парковак прыходзяць у касу ўстановы і аплачваюць доўг. «Былі ў нас пэўныя моманты па закрытых паркоўках, калі чалавек, пакідаючы стаянку, загадзя парушаў правілы паркоўкі і выязджаў так званым «паравозікам». Мы такіх людзей выяўлялі, накіроўвалі лісты ў ДАІ, нам перадавалі кантакты ўласнікаў. Гаворка пра даволі прыстойныя сумы: парадку 6000—7000 рублёў. Усе прыходзілі да нас, пісалі заяву на прадастаўленне растэрміноўкі. Каму на тры месяцы, каму на шэсць», — паведаміў Міхаіл Філіпаў.

## АПЛАЦІЦЬ МОЖНА ТАК:

Па мабільным тэлефоне з дапамогай SMS-запыту праз аператараў мабільнай сувязі, па мабільным тэлефоне з дапамогай USSD-запыту праз аператараў мабільнай сувязі, банкаўскімі пластыкавымі картамі розных стандартаў, выкарыстоўваючы сістэму банкаўскіх плацяжоў АРІП, з выкарыстаннем мабільнага або інтэрнэт-банкінгу праз сістэму банкаўскіх плацяжоў АРІП.

Акрамя таго, можна скарыстацца мабільным сэрвісам «Аплаці», паркаматам для аплаты ў безнаяўным парадку (з дапамогай выкарыстання банкаўскіх карт і мабільнага тэлефона) або заплаціць наяўнымі грашовымі сродкамі праз плацежны тэрмінал з выкарыстаннем сістэмы банкаўскіх плацяжоў АРІП, а таксама наяўнымі сродкамі ў касе.

## «ГАЛОЎНАЕ — З ДУШОЙ ДА ЛЮДЗЕЙ»

Каб на свае вочы ўбачыць, як цяпер арганізавана работа на платных паркоўках, карэспандэнты «Звязды» адправіліся папрацаваць са **спецыялістам па рабоце з кліентамі дзяржаўнай установы «Паркоўкі сталіцы» Гары БАРАНАВЫМ**.

Сустрэліся на платнай паркоўцы, што ўздоўж вуліцы Карла Маркса, 21. Машын — поўна. У сярэднім, па словах спецыяліста, у дзень атрымліваецца праверыць на наяўнасць аплаты парадку 300—350 аўтамабіляў. «Кантроль з вамі будзем ажыццяўляць у межах гэтай платнай паркоўкі, выкарыстоўваць неабходна планшэт, тут устаноўлена праграма, па якой прабіваецца нумар транспартнага сродку, яго рэгістрацыйны знак, — патлумачыў Гары Дзмітрыевіч. — Дадатак паказвае, праведзена аплата кліентам ці не. Калі не, то колькі разоў. Пад рукой заўсёды жоўты лісток — апавяшчэнне, якое мы кладзём звычайна пад лабавое шкло, затым робім фотафіксацыю».

На пытанне, ці маюць месца быць нейкія канфліктныя сітуацыі падчас працы, спецыяліст адказаў станоўча: «Неабходна на месцы ацэньваць тое, што адбываецца. Галоўнае — з душой да людзей».

**Яна ВАЛАСАЧ.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

# «Я ХАЧУ ПАКАЗВАЦЬ ПРЫГОЖУЮ БАРАЦЬБУ»

**У гэтага хлопца ўсё ідзе па плане. Здаецца, сваю спартыўную кар'еру барэц грэка-рымскага стылю Павел ГЛІНЧУК развівае менавіта такім чынам. У 2021-м ён выйграў юніёрскі чэмпіянат свету, заваяваў «серабро» на чэмпіянаце свету сярод спартсменаў да 23 гадоў, стаў бронзавым прызёрам кантынентальнага першынства сярод юніёраў. У 2023-м выйграў чэмпіянат свету U-23, дарэчы, першы залаты медаль гэтага турніру для беларускай барацьбы. У мінулым месяцы Павел Глінчук заваяваў «бронзу» ўжо дарослага чэмпіянату свету. Крок за крокам ідзе да сваіх мэт. Без складанасцяў не абыходзіцца, але і з імі ён спраўляецца спакойна і ўпэўнена. Як гэта ўдаецца, Павел Глінчук расказаў «Звяздзе».**



***— Павел, эмоцыі ад чэмпіянату свету, напэўна, ужо ўлягліся, падзяліцеся ўражаннямі.***

— «Бронза» чэмпіянату свету — доўгачаканы, запаветны медаль. Летась я здабыў ліцэнзію на Алімпійскія гульні 2028 года. Таксама добра, але хацелася менавіта медаль, рэальны. Таму я вельмі задаволены, што на чэмпіянаце свету дамогся жаданага і ўзяў запаветны медаль. Так, пакуль бронзавы, але, думаю, гэта справа часу. Будзем шчырымі, для кожнага спартсмена галоўная мэта — «золата». На секунды падчас схваткі ўявіў свае адчуванні, калі застануся без медаля. Зусім не хацеў гэта перажыць, таму знайшоў у сабе сілы перамагчы хваляванне і адолець сапернікаў.

***— Што яшчэ матывуе перамагаць сапернікаў?***

— Арыенцірам былі і застаюцца Алімпійскія гульні, гэта дзіцячая мара, якая застаецца са мной. І я разумею, што пры пэўных намаганнях мне пад сілу яе ўвасобіць. Не хочацца ў будучыні распавядаць дзецям, што штосьці мог, але не зрабіў. Хочацца гаварыць пра вынікі. Калі яны ёсць, табе і не трэба пра сябе нічога распавядаць, пра цябе скажуць вынікі.

***— Стратэгіі заканчваць схваткі датэрмінова і браць максімум прытрымліваешся да гэтага часу?***

— Мне ў прынцыпе падабаецца прыгожая барацьба, амплітудныя кідкі. Мне не падабаецца, калі схватка заканчваецца з лікам 1:1, нічога барцоўскага ў гэтым не бачу. З прынцыповымі сапернікамі ў гэтым барцоўскім часам варта і да гэтай тактыкі звяртацца. Але ў асноўным я хачу паказваць прыгожую барацьбу, барацьбу з яе лепшага боку — прыгожыя кідкі, цікавыя прыёмы.

***— Ці ўсе сапернікі гатовыя да такой барацьбы, гэта ж, напэўна, у разы складаней?***

— Складаней, але і цікавей. У кожнага барца павінен быць свой арсенал прыёмаў. Мне ў гэтым плане пашанцавала, бо я выступаў ва ўсіх вагавых катэгорыях ад лёгкай да цяжкай, у мяне сфарміраваўся багаж розных прыёмаў. У цяжкай катэгорыі, у якой цяпер выступаю, мала хто здзіўляе прыёмамі, але ў мяне вопыт багаты.

***— Цябе трэніруе Міхаіл Уладзіміравіч Сямёнаў — бронзавы прызёр Алімпійскіх гульняў у Пекіне. Сваім спартыўным вопытам трэнер дзеліцца?***

— Незадоўга да вылету на чэмпіянат свету я трапіў у госці да Міхаіла Уладзіміравіча, і ён запрасіў мяне ў святая святых — своеасаблівы музей, дзе захоўваюцца ўсе яго ўзнагароды. І даў мне патрымаць свой алімпійскі медаль. Я нават не думаў, што мяне гэта так зарадзіць. Нам пашанцавала працаваць з алімпійскімі чэмпіёнамі і прызёрамі, з чэмпіёнамі свету. Няхай і падсвядома, мы арыентуемся на іх дасягненні. Думаю, без такіх прыкладаў побач, нам, маладым спартсменам, было б у разы складаней. Напрыклад, старшыня Беларускай федэрацыі барацьбы Алім Максімавіч Селімаў — двухразовы чэмпіён свету — прайшоў увесь гэты шлях, ён выдатна разумее наш стан. І яго парады перад чэмпіянатам свету пайшлі нам толькі ў плюс.

***— На Алімпійскіх гульнях у Атланце Карэлін выступаў з адарванай грудной мышцай. Табе даводзілася праводзіць схваткі з сур'ёзнай траўмай?***

— Незадоўга да турніру, на якім разыгрываліся ліцэнзіі на Алімпійскія гульні, я зламаў галенастоп. Вельмі складаны пералом, мінімум паўтара месяца на аднаўленне. Але мне трэба ехаць на турнір, я хачу на Алімпіяду. Праз тыдзень зняў гіпс і пачаў фарсіраваць сваё аднаўленне, пачаў рыхтавацца да спаборніцтваў. Ад пералому да ліцэнзіі прайшло прыкладна паўтара месяца — фактычна, я змагаўся са зламанай нагой.

***— У лютым на фінале «Лігі храбрых» вы з Кірылам Маскевічам правялі схватку за тытул абсалютнага чэмпіёна краіны. І наогул сёння спаборніцтвы па барацьбе праходзяць з элементамі шоу. Як табе такі фармат?***

— Што датычыцца той схваткі, то ідэя мне прыйшла ў галаву цалкам выпадкова. Але Кірыл і арганізатары «Лігі храбрых» яе падтрымалі. Я гэты выклік кінуў, сам жа схватку прайграў, цяпер чакаю рэваншу. Прызнаюся, што сам неяк несур'ёзна паставіўся да падрыхтоўкі, а гэта няправільна. Што датычыцца шоу, то мы, барцы, на чале з Алімам Максімавічам, пазбавіліся нейкай барцоўскай кансерватыўнасці, якая была нам уласцівая. Барцы заўсёды былі даволі сціплымі, нярэдка гэта сціпласць пераходзіла ў замкнёнасць. Не давалі інтэрв'ю, не ўдзельнічалі ў розных праектах, ціха-спакойна «варыліся» ў сваім асяроддзі. Але гэты час прайшоў. Сёння трэба быць навідавоку, паказваць свой від спорту, прыцягваць да яго ўвагу. У гэтым кірунку актыўна працуе наша федэрацыя і мы, спартсмены, усяляк у гэтым дапамагаем. Мне падабаецца змагацца перад гледачамі. Я хачу, каб на нашы спаборніцтвы прыходзіла больш людзей. Я бачу, што цікавасць да барацьбы вырасла, намі цікавяцца журналісты, блогеры, медыйныя людзі. Значыць, мы на правільным шляху.

***— Павел, цябе часта называюць узыходзячай зоркай, ускладаюць на цябе вялікія надзеі. Як ты сам да гэтага ставішся?***

— Калі мне пра гэта кажуць, я адразу думаю, як не згубіцца. Шмат выпадкаў, калі тыя, каго лічылі перспектыўнымі спартсменамі, акрамя перспектыў, нічога не прынеслі. Таму я стараюся і іншым раю не цешыць сябе. Назвалі ўзыходзячай зоркай — падзякуй і ідзі далей. Вось мне 24 гады, па сутнасці, у запасе ёсць яшчэ два алімпійскія цыклы. Прыкладна восем гадоў, і прыйдзецца развітвацца з барацьбой. Часу мала, таму не думаю пра тое, што ад мяне чакаюць, а імкнуся рэалізоўваць свае магчымасці і патэнцыял тут і цяпер.

***— На якім турніры табе гэта ўдалося лепш за ўсё, калі не браць у разлік нядаўні чэмпіянат свету?***

— На чэмпіянаце свету сярод моладзі. У мяне быў няпросты перыяд, пасля якога я ўвайшоў у каляіну і выйграў гэты чэмпіянат. І хоць да гэтага я ўжо выйграваў першынства свету, эмоцыі былі незабыўныя, таму што радасць прыносіць усведамленне таго, што ты справіўся з цяжкасцямі і працягнуў перамагаць. Пасля пройдзеных цяжкасцяў больш шануеш перамогі.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота з адкрытых крыніц.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ОАО «Н Холдинг» проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества**

**Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Н Холдинг» по организации и проведению аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **ЛОТ № 1** | Изолированное помещение с инв. № 500/D-7113080, расположенное по адресу: г. Минск, пер. Софьи Ковалевской, 52-1. Площадь – 5132,2 кв. м. Наименование – Помещение многофункциональное. Назначение – Помещение многофункциональное. Объект недвижимости обременен арендой, ипотекой. Продавец обязуется снять обременение ипотекой до момента государственной регистрации договора купли-продажи с покупателем | | | | |
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **5 073 180,00** | **Задаток, BYN** | **507 318,00** | **Шаг аукциона** | **5 %** |
| **Сведения о продавце/ организаторе аукциона, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «Н Холдинг» 220029, г. Минск, пр-т Машерова, 11, пом. 1. Тел. 8 029 754 63 46 Мария, e-mail: arenda@h-holding.by | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **10 (десяти) рабочих дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона** | Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение **5 (пяти) календарных дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона | | | | |
| **Условия оплаты** | Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях (нерезидентами – в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты) на следующие банковские реквизиты: р/с BY79 AKBB 3012 0000 1634 1000 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, 220005, г. Минск, пр-т Независимости, 56. Получатель – Открытое акционерное общество «Н Холдинг», УНН 101059240, ОКПО 37392696. Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за объект, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе** | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **по 13 ноября 2025 включительно** в рабочие дни с 9.00 до 16.55 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1 | | | | |
| **Место, дата и время проведения аукциона** | Аукцион состоится **14 ноября 2025 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, 35-1, зал совещаний ОАО «Н Холдинг» | | | | |

Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время, без объяснения причин, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от проведения аукциона

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ООО «Энтер», 220070, г. Минск, ул. Щербакова, 34-23 |
| **Наименование предмета электронных торгов:** административное здание (Здание административно-хозяйственное), 500/C-4894, общей площадью 643,9 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Щербакова, 34 | **Начальная цена (НДС не облагается): 990 000,00 бел. руб.** |

**Дополнительная информация:**
**1. В состав лота входит:** ограждение лестницы, инв. № 00000110; пожарная сигнализация, инв. № 00000107; прибор учета холодной воды МТК-25ХВ с модулем сбора данных, заводской номер 23007309, инв. № 00000104; система видеонаблюдения, инв. № 00000108; теплосчетчик ТЭМ-104М-1 dy25 с LTE, заводской номер 20209452, инв. № 00000112; электросчетчик заводской номер 02036899, инв. № 00000106; электросчетчик ЭЭ8005/2К, заводской номер 929008, инв. № 00000113.
**2. Обременения: аренда. Подробная информация на сайте организатора аукциона ИПМ-Торги (www.ipmtorgi.by).**
**3. Сведения о земельном участке с кадастровым номером 500000000001000366:** предоставлен на праве постоянного пользования для эксплуатации и обслуживания административного здания общей площадью 0,0949 га

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату внесения платежа на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **3 %** от цены продажи в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 24.06.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 06.11.2025 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки,
в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **05.11.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 373 21 33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

СПОРТ-ТАЙМ

# 122 МЕДАЛІ І БЯЗМЕРНЫ ДОСВЕД

## Чым для нас адметныя III Гульні краін СНД

Кожны буйны міжнародны старт — гэта не толькі колькасць заваяваных медалёў і ўсталяваных рэкордаў. Гэта яшчэ і своеасаблівы індыкатар таго, як развіваецца сістэма спорту, паказчык яе пераваг і недахопаў. І кожны міжнародны старт для спартыўнай сістэмы — урок, нават экзамен.





Зусім нядаўна наш спорт здаваў чарговы экзамен. III Гульні краін СНД, якія праходзілі ў Азербайджане, прынеслі нашай краіне 122 медалі. Беларускія спартсмены сталі прызёрамі ва ўсіх відах спорту, у якіх удзельнічалі. Усяго ў актыве каманды 32 залатыя, 38 сярэбраных і 52 бронзавыя ўзнагароды. Рэкардсменамі па колькасці ўзнагарод сталі плыўцы — 35 медалёў (4 залатыя, 15 сярэбраных і 16 бронзавых). Двухразовым чэмпіёнам III Гульняў краін СНД стаў Усевалад Сараковік.

Рэкардсменамі па колькасці залатых узнагарод сталі весляры на байдарках і каноэ. Яны дзевяць разоў падымаліся на вышэйшую ступень п'едэстала. Высокі клас беларускай вяслярнай школы яны пацвердзілі ўпэўнена. Трохразовыя чэмпіёны Гульняў — Эміль Абалмасаў і Арцём Вайцешын. «Вынікамі, вядома, задаволены. III Гульні краін СНД былі апошнімі спаборніцтвамі сёлета, і тут удалося заваяваць тры «золата». Звычайна сезон у нас заканчваецца значна раней, таму было складана, але справіўся», — дзяліўся ўражаннямі Эміль Абалмасаў. Па прозвішчы нескладана здагадацца, што ён — сын вядомага беларускага весляра, алімпійскага чэмпіёна 2008 года Аляксея Абалмасава. І спадзявацца толькі на гены, вядома, не варта, але 18-гадовы спартсмен ужо добра зарэкамендаваў сябе на міжнародным узроўні. Шэсць залатых і адну сярэбраную ўзнагароду заваявалі скакуны на батуце, трохразовай чэмпіёнкай стала Яна Лебедзева.

У медальным заліку каманда Беларусі заняла трэцюю пазіцыю сярод трынаццаці краін-удзельніц. На вяршыні апынулася дэлегацыя з Расіі (231 медаль), другімі сталі гаспадары спаборніцтваў (Азербайджан), якія ўзялі 184 узнагароды. «Ваш талент, упартыя трэніроўкі і імкненне да мэты сталі залогам поспеху. Асобную падзяку хачу выказаць трэнерам і адміністрацыйнаму персаналу каманд. Без вашай самааддананасці, цярпення і адданасці справе нашы атлеты не дабіліся б такіх высокіх вынікаў», — адзначыў у сваім віншаванні **прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Віктар ЛУКАШЭНКА.**

**Намеснік міністра спорту і турызму Аляксандр БАРАЎЛЯ** вынік беларускіх спартсменаў назваў добрым, тым больш што па кожнай дысцыпліне барацьба за медалі была вельмі сур'ёзная. «Мы настройваліся і казалі, што прадстаўляем не від спорту, а краіну. Калі браць асобныя дысцыпліны, многіх хацелася б вылучыць. Напэўна, пачну з каманды тэхвандыстаў — тры залатыя медалі і яшчэ два фіналы. Задалі «медальны тон». Хацелася б адзначыць нашых плыўцоў — у вельмі сур'ёзнай канкурэнцыі з расійскімі спартсменамі годна трымаліся. Тут у нас вялікі патэнцыял. Юніёры паказалі добры вынік. З імі можна і трэба працаваць. Батутыстаў таксама хачу адзначыць — шэсць залатых узнагарод і адна сярэбраная. Жаночая каманда па вольнай барацьбе выдатна сябе праявіла і заваявала чатыры залатыя медалі, — падкрэсліў Аляксандр Бараўля ў інтэрв'ю парталу Sport5by. — Напэўна, у грэка-рымскай барацьбе, самба і стральбе нашы спартсмены маглі заваяваць крыху больш. Усе стараліся і працавалі на максімум. Гэта магчымасць прааналізаваць падрыхтоўку нашага рэзерву і ўнесці карэктывы. Карысна было паглядзець і на нашых канкурэнтаў. Гэта добры досвед».

**Валерыя СЦЯЦКО.**

**Фота з адкрытых крыніц.**

НАДВОР'Е

# ПРЫЧАКАЛІ ПЕРШАГА СНЕГУ

## Ноччу і раніцай магчымы і галалёд

На фоне пастаянных замаразкаў ноччу і слаба станоўчых тэмператур днём чакаецца мокры снег. Аб гэтым паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

З падобнымі характарыстыкамі мы сутыкнёмся ўжо сёння, калі ўмовы надвор'я працягнуць вызначаць тылавая частка цыклона з цэнтрам над Еўрапейскай тэрыторыяй Расіі і халодныя няўстойлівыя паветраныя масы з паўночных шырот. Будзе воблачна з праясненнямі. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу, магчымы мокры снег. Вецер паўночна-заходні, заходні ўмераны, месцамі парывісты. Тэмпература паветра мінімальная ноччу ад 1—6 °С, а днём +4—10° С.

У сераду ўмовы надвор'я будуць не самыя камфортныя: на большай частцы тэрыторыі рэспублікі пройдуць ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Ноччу і раніцай месцамі слабы галалёд. Вецер паўночна-заходні, заходні ўмераны, удзень месцамі парывісты. Тэмпература паветра ўначы ад 1 да 5 °С, пры праясненнях чакаюцца замаразкі да мінус 2 °С, а днём будзе не вышэй за 4—11 °С.

У чацвер на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу, ноччу з мокрым снегам. Ноччу і раніцай месцамі слабы туман і галалёд. Вецер заходні, паўднёва-заходні ўмераны, удзень месцамі парывісты. Тэмпература паветра ўначы ад 1 да 7 °С, пры праясненнях замаразкі да мінус 2 °С. Тэмпература паветра днём стане крыху вышэй — ад 6 да 13 °С.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Надвор'е на заўтра

| | | |
|---|---|---|
| МІНСК 763 мм рт.сл. | +3..+5 °С | +5..+6 °С |
| ВІЦЕБСК 761 мм рт.сл. | +3..+4 °С | +4..+6 °С |
| МАГІЛЁЎ 762 мм рт.сл. | +2..+3 °С | +5..+6 °С |
| ГОМЕЛЬ 762 мм рт.сл. | +3..+4 °С | +5..+6 °С |
| ГРОДНА 765 мм рт.сл. | +4..+6 °С | +9..+11 °С |
| БРЭСТ 765 мм рт.сл. | +5..+6 °С | +8..+10 °С |

Паводле даных Белгідрамета

### ...у суседзяў

МАСКВА +2..+4 °С

С.-ПЕЦЯРБУРГ +5..+6 °С

### Месяц

Апошняя чвэрць 13.10.–20.10. Месяц у сузор'і Льва.

### Геамагнітныя ўзрушэнні




Абазначэнні:
- — няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў
- — невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
- — слабая геамагнітная бура
- — малая геамагнітная бура



Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

## 14 КАСТРЫЧНІКА — Даты / Падзеі / Людзі

У краіне

**1915** год — нарадзіўся Усевалад Ігнатавіч Краўчанка (в. Каплічы Калінкавіцкага р-на Гомельскай вобл.), беларускі пісьменнік, драматург, перакладчык. Аўтар кніг «На крутым павароце», «Калгасныя наввэлы», зборніка п'ес «Апошняя варажба». Пісаў таксама для дзяцей. Пераклаў на беларускую мову раман А. Ганчара «Сцяганосцы», аповесці В. Катаева, А. Гайдара і інш.

**1935** год — нарадзіўся Леанід Андрэевіч Якаўлеў, беларускі навуковец у вобласці жывёлагадоўлі, доктар сельскагаспадарчых навук (1993). У 1959 г. скончыў Віцебскі ветэрынарны інстытут, працаваў у Беларускім НДІ жывёлагадоўлі. Аўтар навуковых прац па прыватнай заатэхніі, тэхналогіі вытворчасці прадуктаў жывёлагадоўлі, умоў утрымання сельскагаспадарчых жывёл.

**1940** год — нарадзіўся Леанід Леанідавіч Іваноў (г. Магілёў), беларускі дырыжор, педагог, заслужаны настаўнік Беларусі (1977), народны артыст Беларусі (2008), лаўрэат Спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Ганаровы грамадзянін Магілёва.

У свеце

**1900** год — нарадзіўся Барыс Пятровіч Мікольскі, рускі навуковец у вобласці прыкладной і тэарэтычнай радыёхіміі, акадэмік АН СССР (1968), Герой Сацыялістычнай Працы (1970). Адзін з аўтараў фундаментальнай працы «Тэарэтычны і практычны дапаможнік да лабараторных работ па фізічнай хіміі». Лаўрэат Ленінскай прэміі (1961), Дзяржаўнай прэміі СССР (1949, 1973).

**1905** год — у Парыжы заснавана Міжнародная авіяцыйная федэрацыя (ФАІ).

**1944** год — міжнародны факультэт МДУ быў пераўтвораны ў Маскоўскі дзяржаўны інстытут міжнародных адносін.

**Калектыў Выдавецкага дома «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні Ларысе Іванаўне ЦІМОШЫК з прычыны напаткаўшага яе вялікага гора — смерці МАЦІ.**


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 12 560. Індэкс 63850. Зак. № 2203.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 13 кастрычніка 2025 года.